Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 159 (4992)
ЛІПЕНЬ
21
СУБОТА
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Москва
Старая площадь 4 Культпрогу Архив
4-й этаж комн. 104
на 1934 г.
Звезда

СЁННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: — ПЕРАДАВЫ—УЛІЧЫЦЬ УРОКІ ПЕРШЫХ ДЗЁН УБОРКІ. А. МІРОНАЎ—ЛОГІКА ВАДАЛАЗА. ОФЕНГЕЙМ—РАБОЧАМУ ВЫСОКАЯКАСНЫ І ТАННЫ АБЕД. ЗДАНОВІЧ — КАНТРОЛЬ ВЫКАНАННЯ—У ЦЭНТР УВАГІ.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ: А. МАНЬКОЎ—КЛАСАВЫ ВОРАГ ВЫКРЫТ.

АРЦЁМ СТАЛЬ—РАШАЮЧАЯ ЗАДАЧА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА БОЛЬШЭВІЦКІЯ ЖЫВЕЛАГАДОЎЧЫЯ КАДРЫ. В. АНЭТ—АБМЕН ВОПЫТАМ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ.

ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ ТОРФУ.

ЗА МЯЖОЙ:

СЁННЯ МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ АБАРОНЫ ТЭЛЬМАНА.

СТАЧАЧНЫ РУХ У ЗША ПАШЫРАЕЦЦА.

ПАВОДКА Ў ПОЛЬШЧЫ.

БЕРАЖЛІВАСЦЮ НА УБОРЦЫ УЗНІМЕМ ВАГУ КАЛГАСНАГА ПРАЦАДНЯ

ЗМАГАЦЦА СА СТРАТАМІ ПРЫ ПРЫЁМЦЫ ЗБОЖЖА І ХАВАННІ НА СКЛАДАХ ТАКСАМА ЯК І НА ЎБОРЦЫ

УЛІЧЫЦЬ УРОКІ ПЕРШЫХ ДЗЁН УБОРКІ

Раннія тэрміны сяўбы, вялікі энтузіязм, з якім калгасныя масы змагаліся за высокі ўраджай, дае свае вынікі. БССР адносіцца да тых раёнаў, аб якіх пленум ЦК ВКП(б) адзначыў, што ўраджай у іх вышэй леташняга.

У небывала раннія тэрміны пачалася ўборка ўраджаю па Беларусі. 40 раёнаў на 15 ліпеня разгарнулі жніво жыта і ячменю, 20 раёнаў пачалі цераблённе ільну. На сёнешні дзень уборка разгарнулася па ўсіх раёнах БССР.

Аднак, трэба падкрэсліць, што **не ва ўсіх раёнах аднолькава дружна ўзяліся за ўборку.** У той час, калі Камарынскі раён на 15 ліпеня ўбраў 37,8 проц. зернавых, а Брагінскі 20 проц., то суседні з ім Лоеўскі раён нават не прыступаў да ўборкі, а Церахаўскі раён убраў толькі 3 проц. Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб разгортванні ўборкі па меры выспявання асобных участкаў не ўсюды належным чынам улічана.

У радзе раёнаў і калгасаў не ўлічваюць, што збожжа паспявае нярэўнамерна. Так, напрыклад, у Мазырскім раёне ў калгасах імя Дзержынскага, Фрунзе і інш., нават не арганізован нагляд за выспяваннем асобных участкаў, ігнаруецца выбарачная ўборка збожжа, чакаюць агульнага паспявання вялікіх масіваў. Такое-ж становішча і ў радзе іншых раёнаў (Церахоўка, Чырвоная Слабада). У выніку ствараецца яўная пагроза значных страт ад асыпання зярна.

У той час як 20 раёнаў БССР прыступілі да цераблення ільну, калі перадавы Сенненскі раён на 15 ліпеня ўбраў 8 проц. ільну, некаторыя ільнаводчыя раёны, як, напрыклад, Лепельскі мяркуюць распачаць цераблённе толькі пасля ўборкі зернавых. Лішне гаварыць, да якіх вялікіх страт можа прывесці такая шкодная практыка. Гэта сігналізуе аб тым, што не ўсе раёны ўсвядомілі цэнтральную задачу сёлетняй уборачнай кампаніі — барацьбу са стратамі.

Калгасы БССР у гэтым годзе пачалі ўборку на многа лепш тэхнічна ўзброенымі. Пры поўным скарыстанні ўборачных машын мы маем магчымасць убраць жняяркамі каля 50 проц. ўраджаю. Між тым, першыя дні ўборкі паказваюць, што жняяркі вельмі слаба скарыстоўваюцца, а ў асобных месцах нават ігнаруюцца. Так, у калгасе імя Варашылава (Мазырчына) 5 жняярак за дзень зжалі толькі 7 гектараў. У калгасе «Чырвоны рассвет», Церахаўскага раёна, з першага-ж дня ўборкі машыны пачалі выбываць са строю. Справа, аказваецца, у тым, што рамонтам машын ніхто не цікавіўся, не правяраў іх якасці. І вось з-за розных «дробязей» машыны дняні прастойваюць. Тут бязгоўна адыгрывае сваю ролю і слабая падрыхтоўка людзей, якія працуюць на машынах.

Вопыт перадавых калгасаў паказвае, што пры добрым падборы людзей, пры арганізацыі двухзменнай работы жняярка на зменных здаровых конях можа ўбраць за дзень ад 5 да 6 гектараў. За выкананне гэтай нормы павінен змагацца кожны калгас, кожны калгаснік, які працуе на жняярцы.

Нельга не адзначыць і позняга ўступлення ва ўборку трактарных снопавязалак. Тут асабліва дае сябе адчуваць чаканне агульнага выспявання збожжа. Такая практыка награджае вялікімі стратамі, толькі на руку класаваму ворагу.

Пленум ЦК КП(б)Б абавязаў раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі забяспечыць максімальнае паўсямеснае прымяненне **КАСЫ** на ўборцы зернавых. Ва многіх раёнах аб карысці касы прыйшла нямала прыгожых пастаноў. Але канкрэтна арганізаваць справу не здолелі. Возьмем, напрыклад, Чэрыкаўскі раён. Гэты раён тэхнічна менш узброены, чым іншыя раёны БССР. Трэцяя частка калгасаў тут не мае жняярак. У радзе-ж калгасаў гэтага раёна жніво жыта распягваецца на 14-15 дзён, а да практычнага прымянення касы на ўборцы так і не прыступілі. Чэрыкаўскі раён найбольш характэрны па ігнараванню касы, але не адзіны. Падшыльдай мнімай барацьбы са стратамі касу ігнаруюць і ў Полацкім, Бабруйскім, Асіпавіцкім і іншых раёнах і гэтым самым зрываюць указанне пленума ЦК аб правядзенні ўборкі ў максімальна кароткія тэрміны і без страт.

Агульнавядома, што арганізацыя працы рашае поспех уборкі. На справе-ж ва многіх раёнах і калгасах дагэтуль няма абдуманага, канкрэтнага плана расстаноўкі людзей. Напрыклад, у радзе калгасаў Аршанчыны звенні на ўборцы зусім не арганізаваны, працуюць скопам. Часта бываюць выпадкі (Мазыр), калі ў адным і тым-жа калгасе, на адной і тойжа рабоце ў адной брыгадзе прымяняецца індывідуальная здзельшчына, а ў другой працуюць вялікімі групамі, не гледзячы на відавочныя перавагі індывідуальнай здзельшчыны. Гэта сведчыць, што і на гэтым адказнейшым участку ўборачнай часта пануе самацёк.

Трэба ўжо зараз пашырэдзіць супроць існуючай у радзе месц шкоднай «тэорыі», што «аднаасобнікаў на ўборцы арганізоўваць не трэба, яны і самі ўбяруць». На практыцы гэта «тэорыя» прыводзіць к таму, што спроц працоўных аднаасобнікаў не праводзіцца ніякай масава-арганізацыйнай і растлумачальнай работы, што такая простая справа, як арганізацыя агульных токаў для малацьбы збожжа аднаасобнікаў, у большасці раёнаў не арганізавана.

Дзесяцідворкі даказалі сваю вялікую ролю ў часе веснавой пасеўнай кампаніі. Без перабалічэння можна сказаць, што поспех уборкі і выканання дзяржаўных планаў паставак па аднаасобнаму сектару буйе залежыць ад таго, наколькі будзе арганізавана работа з дзесяцідворкамі і іх упаўнаважанымі, з тым, каб з першыхжа дзён даць знішчальны адпор кулацкім, сабатажніцкім элементам.

Сігналы першых дзён уборкі паказваюць, што ў БССР яшчэ не ўсё зроблена для правядзення ўборкі без страт, у максімальна кароткія тэрміны. Задача раённых арганізацый, палітаддзелаў МТС і соўгасаў — яшчэ раз праверыць, як арганізавана барацьба са стратамі на кожным участку работы. Арганізаваць нагляд за выспяваннем збожжа, прасачыць, як працуюць машыны, дабіцца прыстасавання да кожнай з іх зернаўлавіцеля, наладзіць падрабанне калосаў — значыць папярэдзіць страты мільёнаў пудоў хлеба, своечасова выканаць свае абавязкі перад дзяржавай, узняць калгасную заможнасць.

21 ЛІПЕНЯ

Ранняя ўборка дае магчымасць правесці збожжапастаўкі ў найкарацейшыя тэрміны. Гэта патрабуе ад загатоўчых арганізацый максімальнай падрыхтаванасці да своечасовага і высокаякаснага прыёму збожжа. Барацьба са стратамі пры прыёме збожжа на складах набывае не меншае значэнне, чым на полі і на таку.

Аднак, сігналы з месц паказваюць, што загатоўчыя арганізацыі недаацэньваюць гэтую справу. Некаторыя раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі лічаць, што кіраўніцтва падрыхтоўкай складаў—не іх справа. У выніку мы маем такое становішча, калі ў Слуцку склады і пад'язныя шляхі яшчэ і зараз не падрыхтаваны. Пагражаючае становішча ў Лельчыцкім раёне, дзе ні адзін склад не гатоў да прыёму збожжа. Такое-ж становішча і ў радзе іншых раёнаў.

Не на многа лепш стаіць справа з кадрамі. У Барысаўскім раёне, напрыклад, загатоўчы апарат дагэтуль поўнасцю яшчэ не ўкамплектован. Асабліва дрэнна падрыхтован апарат па сістэме Наркомпроса і Белкаапсаюза, якія ў гэтым годзе павінны прыняць значную колькасць збожжа.

Факт прыёму недобраякаснага зараженага кляшчом збожжа Мазырскай канторай «Заготзярна» паказвае, не толькі непадрыхтаванасць апарата «Заготзярна», але і нездавальняючую работу дзяржаўнай інспекцыі. Безадказна адносяцца да дэзінфекцыі калгасных складаў і райземаддзелы і МТС.

Абавязваны ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ і рэдакцыяй «Звязды» рэйд праверкі гатоўнасці да прыёму збожжа павінен мабілізаваць усю працоўную грамадскасць на выяўленне і ліквідацыю недахопаў у рабоце прыёмачнага апарата.

АХОЎВАЦЬ УРАДЖАЙ

КРУПКІ. У радзе калгасаў раёна выбарачным парадкам пачалі ўборку ільну і зернавых. Калгас «Будаўнік культуры», Халопеніцкага сельсовета, ужо ўбраў 7 гектараў ільну. Калгас «Новы шлях» убраў два гектары ячменю. Прыступілі да ўборкі дзесяткі калгасаў.

Першыя дні ўборкі паказалі, што класавыя ворагі прабуюць пажывіцца за кошт добрасумленных калгаснікаў. За апошнія дні выяўлена рад выпадкаў отрыжкі калосаў на калгасных палях. Так, у калгасе «Праўда» злавілі на полі аднаасобніка Крапіўку Герасіма, які нёс наспрыжаное збожжа. У калгасе «Чырвоны барацьбіт» злоўлен з мяшком калосся аднаасобнік Камашцзей. Такі-ж факт быў і ў соўгасе Каменка.

Гэтыя факты сведчаць аб дрэннай арганізацыі аховы ўраджаю ў раёне. У радзе калгасаў («Большэвік» і іншых) пабудаваны вышкі, але на гэтых вышках ніхто не дзяжурыць. Тут адзінокія вышкі толькі нагадваюць аб бязадказнасці кіраўнікоў калгасаў і дазораў.

Выязная рэдакцыя «Звязды» ў Крупскім раёне.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ПРАВЕРКІ ГАТОЎНАСЦІ ДА ПРЫЁМКІ ЗЯРНА

ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ і «Звязда» аб'яўляюць з 25 па 30 ліпеня ўсебеларускі рэйд праверкі гатоўнасці да прыёмкі зярна.

ПРАГРАМА РЭЙДА: становішча складаў і тэхнічнай базы, добраякаснасць рамонту, дэзінфекцыя (барацьба з кляшчом), падрыхтаванасць вагі, пад'язных шляхоў і проціпажарная ахова.

Забяспечанасць прыёмачнага апарата кваліфікаванымі і клясава вытрыманымі кадрамі, арганізацыя бесперабойнай і высокаякаснай прыёмкі зярна і разліку са здатчыкамі.

Культбытавое абслугоўванне здатчыкаў. Як падрыхтавалася кааперацыя і іншыя арганізацыі. Арганізацыя на пунктах пункту, справачных сталоў, кіно, радыё.

Усе райпрофсоветы, райкомы комсамола і раённы друк павінны неадкладна ўключыцца ў рэйд-праверку, прыцягнуць да ўдзелу ў ім рабочых і калгасных актыў, рабселькораў.

Старшыня ЦСПСБ КАВАЛЬЧУК.
Сакратар ЦК ЛКСМБ СТУКАЛАЎ.
Адказны рэдактар «Звязды» ЛЕНЦНЕР.

НА ЖНЯЯРЦЫ МОЖНА ЗА ДЗЕНЬ УБРАЦЬ СЕМ ГЕКТАРАЎ

КРЫЧАЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ АД КАРЭСПАНДЭНТА «ЗВЯЗДЫ»). МАШЫНІСТ ЛАЎРЭНАЎ СЦЯПАН З КАЛГАСА ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, МАЛЯЦІЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА, НА ЖНЯЯРЦЫ-САМАСКІДЦЫ ЗА ДЗЕНЬ ЗЖЫНАЕ 7 ГЕКТАРАЎ. ЖНЯЯРКА ПРАЦУЕ АД ЦЯМНА ДА ЦЯМНА. ПАДЗМЕННЫМ МАШЫНІСТАМ ПРАЦУЕ КАЛГАСНІК ГАЛАНДЗІН. КОНІ МЯНЯЮЦЦА ТРЫ РАЗЫ.

ВІШНЕЎСКІ.

ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ КЛІЧАЎШЧЫНЫ

Сёлета Клічаўскі раён скончыў слубу на 35 дзён раней чым у мінулым годзе. Меліярацыя нізкіх калгасных палёў, лепшая чым у мінулым годзе якасць слубы, прапоры і іншых агрэгатаў забяспечылі добры, лепшы чым у мінулым годзе, ураджай.

Гэтыя поспехі калгасаў выклікалі новы прыліў, а таксама арганізацыю новых калгасаў у раёне.

Так, у Ганчанскім сельсавеце арганізован калгас «ШЛЯХ ОКЦЯБРА», у Дзяўшанскім сельсавеце — арганізаваны калгасы «УДАРНІК», «НОВЫ СВЕТ», «ПАБЕДА». У Ядрэна-Слабодскім сельсавеце—калгасы «ЧЭЛЮСКІНЕЦ» і «ЧЫРВОНАЯ ДРУЦЬ».

300 ГАСПАДАРАК УСТУПІЛІ У КАЛГАСЫ

РАСПРАЦОЎКА РАШЭННЯЎ АПОШНІХ ПЛЕНУМАЎ ЦК ВКП(б) І КП(б)Б, РАЗГОРТВАННЕ ЎБОРКІ ЗЕРНАВЫХ АЗНАМЕНАВАЛІСЯ Ў БАРЫСАЎСКІМ РАЁНЕ ПРЫЛІВАМ ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ У КАЛГАСЫ І АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВЫХ КАЛГАСАЎ.

У КАЛГАС «ПАЛІТАДДЗЕЛАВЕЦ», ЛОШНІЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА, УСТУПІЛІ 36 ГАСПАДАРАК. У ГЭТЫМ-ЖА СЕЛЬСОВЕЦЕ ЗА АПОШНІ ЧАС АРГАНІЗАВАНЫ ТРЫ КАЛГАСЫ. АРГАНІЗАВАН НОВЫ КАЛГАС У ВЁСЦЫ ВОРКІ. ЗАЧЫЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА І Ў ВЁСЦЫ ПАГАДЗІЦА, НЕМАНІЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА.

УСЯГО ЗА АПОШНІ ЧАС УСТУПІЛА Ў КАЛГАСЫ 300 ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК.

СКЛАДЫ НЕ ГАТОВЫ ДА ПРЫЁМКІ ЗБОЖЖА

Як слуцкае аддзяленне Заготзярно і іншыя прыёмачныя арганізацыі падрыхтаваліся да сустрэчы новага ўраджаю? Слуцкай канторы Заготзярно не хапае складаў на 4 тыс. тон. Пастановай РВК па ўзгадненню з адпаведнымі арганізацыямі канторы Белитушка, Сакотабак павінны перадаць Заготзярно свае склады. Прайшлі ўжо ўсе вызначаныя тэрміны для падрыхтоўкі гэтых складаў, але і па сёнешні дзень гэтыя арганізацыі яшчэ не аслабанілі складаў.

600 тон збожжа новага ўраджаю павінен прыняць леспрамгас, але дырэкцыя леспрамгаса літаральна нічога не зрабіла да арганізацыі прыёмкі. Толькі 14 ліпеня дырэкцыя леспрамгаса выслала людзей на раён для падрыхтоўкі складаў. Але канкрэтна, што зрабілі гэтыя людзі для падрыхтоўкі складаў, на колькі яны забяспечаны тэхнічнай базай, хто на якім пункце будзе прымаць, — ніхто з кіраўнікоў леспрамгаса не ведае.

Не лепш справа і з падрыхтоўкай пад'язных шляхоў да складаў. Асаблівую бестурботнасць у гэтай справе праяўляе старшыня горсовета Кабакоў. Дарогі да асноўных складаў для жыта і шпаніцы разбураны. Рамонтныя работы па вуліцы Валадарскага, праз якую будзе праходзіць асноўная маса хлеба, праведзены толькі на 50 проц. Па гэтай вуліцы амаль спынен праезд. Такое-ж становішча і з іншымі пад'ездамі.

Тое-ж самае і з культурна-бытавым абслугоўваннем здатчыкаў. Памяшканне для двух ларкоў і чайных падрыхтавана. Але райспажыўсаюз чамусці лічыць, што выдаткі за рамонт гэтых памяшканняў павінны пакрыць загатоўчыя арганізацыі. «І пакуль загатоўчыя арганізацыі не ўплоцяць за рамонт, — заяўляюць прадстаўнікі райспажыўсаюза, — мы гэтых ларкоў не адкрыем».

Бюракраты з райспажыўсаюза і горсовета, леспрамгаса і загатоўчых арганізацый зрываюць важнейшую справу — падрыхтоўку да прыёмкі збожжа. А раённыя арганізацыі Случчыны ў роли старонніх назіральнікаў, як быццам збожжапастаўкі пачнуцца месяцы праз тры.

Такое становішча пагражае зрывам выканання плана збожжапаставак. Неабходныя меры павінны быць прыняты неадкладна.

В. А.

КАСА ПАСКАРАЕ ЎБОРКУ ЗЕРНАВЫХ

РЭЧЫЦА. У асобных калгасах Рэчыцкага раёна каса для ўборкі зернавых прымянялася яшчэ ў мінулым годзе. Сёлета у гэтых калгасах прымяненне касы набывае масавы характэр.

Так у калгасе «Парыжская Комуна», Бабіцкага сельсовета, асноўная маса хлябоў будзе ўбрана касой. У гэтым калгасе на касавіцу хлябоў пастаўлены лепшыя ўдарнікі. Аб прадукцыйнасці ўборкі касой сведчыць той факт, што тры жанчыны, лепшыя ўдарніцы, ледзь справіліся вязаць снопы за адным касцом.

Да кос прыстасаваны дужкі і грабелькі настолькі дасканала, што яны даюць магчымасць поўнага ўнікнення страт.

Бюро Рэчыцкага райкома партыі прыняло спецыяльную пастанову аб прымяненні кос. Арганізаваны курсы-нарады па перадачы вопыту па прымяненню кос на ўборцы зернавых.

Р. П.

У КАЛГАСЕ ІМЯ Т. ДМІТРАВА (ЗАПАРОЖЖА) ДЛЯ ЗГРАВА КАЛАСОЎ ПРЫСТАСАВАНЫ ГРАБЛІ З ЗАХВАТАМ ДА 2 МЕТР АДЛЕГЛАСЦЬ ПАМІЖ ЗУБ'ЯМІ 4 САНТ.

НА ЗДЫМКУ: ЗГРАБАННЕ КАЛАСОЎ ШЫРОКАЗАХВАТН ГРАБЛЯМІ

ВЕСТКІ З ПАЛЁЎ

Тры калгасы КРЫЧАЎСКАГА раёна прыступілі да цераблення ільну ў мётай спелясці. 20 ліпеня калгас «НОВАЕ ЖЫЦЦЕ» выцерабіў 7 гектараў ільну. Калгас «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ» — тры гектары.

ВІШНЕЎСКІ.

Калгасы БРАГІНСКАГА раёна прыступілі да выкання хлебаставак. На 15 ліпеня калгасы здалі на пункты Заготзярна 47 цэнтнераў ячменю найлепшай якасці.

ШАЙКЕВІЧ.

15 ліпеня калгасы ЛОЕЎСКАГА раёна пачалі здачу збожжа дзяржаве. Першым па здачы ідзе калгас «ВЯЛІКАЯ НІВА», які здаў з першага абмалоту 13 цэнтнераў добрага ячменю. Калгас «ЧЫРВОНАЯ НІВА», Ругаёўскага сельсовета, здаў 8 цэнтнераў ячменю. У раёне разгарнулася спаборніцтва на хутчэйшае выкананне сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

ЖОГ.

ГЛУСК. Калгас «Рэвалюцыйны прызыў» першым у раёне прыступіў да здачы бульбы дзяржаве. На 17 ліпеня калгас здаў 10 тон ранняй бульбы. У той-жа самы дзень Ленінграду адпраўлен першы вагон ранняй бульбы.

ФУКСОН.

МАЗЫР. Соўгас «Ліпава» 15 ліпеня ўбраў 40 гектараў зе вых. Брыгады па ўборцы на жн нах працуюць у дзве змены.

Селькор ТКАЧ

РАГАЧОЎ. Комсамоль ячэйка соўгаса «Дзедлава» атр ла ад райкома комсамола зад засіпасаваць яму ў 50 тон. Яч комсамола пад кіраўніцтвам ко мольскага арганізатара Сухо дырэктара соўгаса Лупачова ў дзённы тэрмін перавыканала за не. Засіпасавала 55 тон. Яч соўгаса «Дзедлаве» выклікала ячэйкі Рагачоўскага раёна па ваць яе прыкладу.

С. Г

КЛІМАВІЧЫ. (Па тэлегра 19 ліпеня пачалося масавае ступленне збожжа на пункты З эрно. За дзень паступіла 378 лю збожжа першага абмалоту.

ШОК.

ДУБРОЎНА. Перадавы гасы раёна 14 ліпеня пачалі ўбо ільну, ячменю і жыта. Калгас « давік» за два дні выцерабіў в рачным парадкам тры гектары ну. Ураджай ільну ў гэтым г па ўсяму раёну на многа по чым летась. Разам з цераблен ільну калгасы жнуць і азімыя.

РЭДАКТАР РАЙГАЗЕТЫ ГУТА

ДЭКАДА, ЯКАЯ РАШАЕ ПОСПЕХ ПЛАНА ТОРФАЗДАБЫЧЫ

Першы злёт знатных людзей торфу закончыў сваю работу. Гэта быў незвычайны злёт — 120 дакладчыкаў. Амаль кожны ўдарнік выступаў, дзяліўся вопытам сваёй работы на торфараспрацоўках. Выступленне кожнага ўдарніка было краснарэчным расказам аб тым, як перадавыя рабочыя змагаюцца за выкананне рашэнняў ЦК КП(б)Б аб бесперабойным снабжэнні прамысловасці апалам.

Ўдзельнікі злёта лішні раз даказалі, што торфяная прамысловасць БССР, кожны завод і брыгада маюць усе магчымасці выканаць план торфаздабычы к 1 жніўня. Гэта яшчэ выразней паказала падрыхтоўка перадавых заводаў—ударнікаў торфу да першага злёту знатных людзей торфу.

Ударнікі торфу далі слова ЦК КП(б)Б і тав. ГІКАЛО, што яны яшчэ з большай энергіяй будуць змагацца, каб падцягнуць адстаючыя ўчасткі да ўзроўню перадавых. Задача партыйных, прафсаюзных, гаспадарчых арганізацый — стаць на чале гэтага ўздыму, дапамагчы знатным людзям торфу ў іх барацьбе за датэрміновае выкананне плана торфаздабычы.

Да канца сезона асталіся пічаныя дні. Між тым, становішча з выкананнем плана торфаздабычы па рэспубліцы застаецца зусім нездавальняючым. Даволі сказаць, што заводы Белторфа на 15 ліпеня выканалі план па здабычы на 70 проц. Ганебна працуюць такія буйныя заводы, як «Асінторф», «Большэвік», «Свабода», «Новы мост» і інш., якія недадалі краіне сотні тысяч тон торфу.

Пагражаючае становішча з выкананнем плана торфаздабычы па сістэме промнаперацыі. На 16 ліпеня сезонны план выканан толькі на 45 проц.

Ці ёсць якое-небудзь апраўданне для адстаючых торфазаводаў БССР. Няма і не можа быць — так вдказалі знатныя людзі торфе на сваім злёце. Яны патрабавалі ад кіраўнікоў і ўсіх рабочых тарфяной прамысловасці падняць тэмпы здабычы, каб да 1 жніўня не было ніводнага завода, які-б не выканаў план торфаздабычы.

Увага кіраўнікоў, усіх рабочых тарфяной прамысловасці павінна быць сканцэнтравана на барацьбе за сушку, за якасць торфу.

Нават на перадавым торфазаводзе «Шлях соцыялізма» нездавальняюча пастаўлена асушка торфу. Сотні тысяч тон торфу, якія ляжаць на палях Асінторфа, заводаў «Большэвік», «Давыдаўка» і т. д., яшчэ не складзены ў штабелі. Кожны дзень прыносіць вялікія страты, а кіраўнікі заводаў не прымаюць канкрэтных мер. З гэтым трэба пакончыць. Ліквідаваць адставанне па сушцы торфу — задача дня.

Справа гонару кіраўнікоў тарфяной прамысловасці, партыйных арганізацый—змагацца за тое, каб к 1 жніўня план торфаздабычы быў выканан.

ЗЛОСНАЕ ПАРУШЭННЕ АГРАПРАВ

ОРША, 17. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Брыгада № 2 калгаса «Верны шлях», Баранскага сельсовета, пачала цераблённе ільну. Выцераблена 2,7 гектара.

З першых дзён уборкі выяўляюцца сур'ёзныя агратэхнічныя і арганізацыйныя непаладкі.

Цераблённе праводзіцца па-старынцы, без сартавання. Не толькі калгаснікі, але і пазаводы-брыгадзіры т. т. КАНАНКОЎ і ГУРЧАНКОЎ аб двайным і трайным цераблённі нічога не ведаюць. Выцераблены лён не ставіцца ў конусы і шатры, як гэтага патрабуе агратэхніка, а рассцілаецца тут-жа на ільнішчы разам з галоўкамі, што награджае вялікімі стратамі.

Жанчыны вышлі на ўборку неарганізавана. Участкі за звенцамі на час уборкі не замацаваны. Працуюць скопам. Ужо на полі калгаснікі самі сабой сходзяцца ў групкі па 5-6 чалавек. Брыгадзіры гэтай актыўнасцю і свядомасцю калгаснікі задаволены. Яны заяўляюць:

— Калгаснікі самі складаюць звенні, нам астаецца толькі зарэгістраваць.

«Рэгістратары» выпадковых звенняў Кананкоў і Гурчанкоў зусім не думаюць аб увядзенні індывідуальнай здзельшчыны. Індывідуальную здзельшчыну яны дапускаюць толькі на выпадак... хваробы. Вось, напрыклад, калгаснікі першай брыгады ГУРЧАН ВАЙ ЛУКЕР'І, якая мае дзі часта хварэе, брыгадзір дазв працаваць індывідуальна.

Норм выпрацоўкі на цераблі ільну брыгадзіры таксама не даюць.

— Якая-ж норма па цераб ню? — пытае брыгадзір Гурчан у брыгадзіра Кананкова.

— Не ведаю. Ведаю толькі, на жніве жыта норма 0,10 ге ра, — адказвае Кананкоў.

— Гэта і я ведаю, — гапар ца Гурчанкоў.

Не ведаюць гэтыя гора-бры дзіры і аб парадку налічэння дзён за работу на ільнацераб ні, абмалоце і т. д. Між тым, вільная адсутнасць работы на іл мае вялікае значэнне.

У рэзультаце дрэннага кіра цтва брыгадамі ільнацерабільн працуюць чарапашымі тэмп група з 6 чалавек выцерабіла дзень 0,39 гектара ільну.

Ёсць пагроза, што і ўборку з навых калгас пачне непадрыхта на, неарганізавана, як пачал ўборку ільну.

Уборачныя прылады да кос падрыхтаваны.

У брыгадзіраў настрой спан ны. Яны разважаюць:

— Спяшацца няма куды. Гл ства. Паспеем. Людзей многа. І тым жыта ячмень і авёс выста ць.

А. МІКУЦКІ

ІНСТРУКТАР--ЦЭНТРАЛЬНАЯ ФІГУРА У ПЕРАБУДОВЕ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

МАТЭРЫЯЛЫ **СЛУЦКАЙ МІЖРАЁННАЙ НАРАДЫ І ВЫСТУПЛЕННІ РАДУ ІНСТРУКТАРОЎ, ЯКІЯ МЫ СЬНЯ ДРУКУЕМ,** ВЫРАЗНА ПАКАЗВАЮЦЬ, ШТО Ў БОЛЬШАСЦІ РАЁНАЎ ПЕРАБУДОВА ПАРТРАБОТЫ АДБЫЛАСЯ БОЛЬШ ФАРМАЛЬНА, ЧЫМ ПА СУТНАСЦІ, ШТО МНОГІЯ ІНСТРУКТАРЫ РК ЯШЧЭ НЕ УСВОІЛІ СВАЁЙ АДКАЗНАЙ РОЛІ. ТЫМ БОЛЬШ РАДАСНА ВЫСТУПЛЕННЕ ІНСТРУКТАРА АРШАНСКАГА РК ТАВ. **ЗДАНОВІЧА,** ЯКІ ПРАВІЛЬНА ПАДКРЭСЛІВАЕ, ШТО ПРАВЕРКА ВЫКАНАННЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА СТРУКТАРА ЗДЗЯЙСНЕННЕМ РАБОТЫ ІНСТРУКТАРА. КАШТОЎНЫ І ТЫЯ ПРЫКЛАДЫ РАБОТЫ З АДЗІНОЧКАМІ-КОМУНІСТАМІ, ЯКІЯ ПРЫВОДЗЯЦЬ ТТ. ЗДАНОВІЧ І БАЛОБІНА.

АДКАЗНАСЦЬ ЗА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧУЮ РАБОТУ ІНСТРУКТАРОЎ НЯСУЦЬ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ САКРАТАРЫ РК, БОЛЬШАСЦЬ ЯКІХ ЯШЧЭ НЕ ЎСВЯДОМІЛА ТУЮ ПРОСТУЮ ІСЦІНУ, ШТО ІНСТРУКТАР—ІХ БЛІЖЭЙШЫ ПАМОЧНІК, І ШТО ШТОДЗЕННАЕ КІРАЎНІЦТВА, ІНФАРМАЦЫЯ, ДАПАМОГА ІНСТРУКТАРУ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ІХ—САКРАТАРОЎ— ПЕРШАЧАРГОВАЙ ЗАДАЧАЙ.

ПЕРАДРУКОЎВАЕМЫ НАМІ ПЕРАДАВЫ «РАБОЧЕЙ МОСКВЫ»—ОРГАНА МАСКОЎСКАГА КАМІТЭТА ПАРТЫІ, ЯКІ ВЫКЛАДАЕ СУТНАСЦЬ ВЫСТУПЛЕННЯ ТАВ. **КАГАНОВІЧА** НА БЮРО МК ПА ПЫТАННЮ АБ ІНСТРУКТАРАХ, ТРЭБА ДАКЛАДНА АБМЕРКАВАЦЬ І ЗРАБІЦЬ УСЕ ПРАКТЫЧНЫЯ ВЫВАДЫ ЎСІМ РК. ІНСТРУКТАР НА СПРАВЕ ПАВІНЕН СТАЦЬ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ ВА ЎСЕЙ СІСТЭМЕ ПЕРАБУДОВЫ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ.

ЯШЧЭ АБ РАБОЦЕ ІНСТРУКТАРОЎ ПАРТЫЙНЫХ КАМІТЭТАЎ

Інструктар партыйнага камітэта павінен з'яўляцца, калі можна так выразіцца, ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ ва ўсёй сістэме перабудовы партыйнай работы. Кадры нашых інструктараў — гэта залатая сіла, якую трэба ўмела скарыстаць і абучыць у рабоце. Нашы райкомы прынялі да гэтага часу колькі-нудзь сур'ёзных мер да таго, каб інструктар сапраўды стаў гэтай ЦЭНТРАЛЬНАЙ фігурай у перабудове партыйнай работы.

Вось чаму дагэтуль многія інструктары не ўсвядомілі выдзяляць галоўныя звенні ў рабоце і ўдучыла прадпрыемствы, не адпрацоўваюць гэтую ролі перадавога вопыту, ня перапераходзяць ў «агентаў» заводу, дыяпазонкай іх даручэнняў, эмі інструктар, не маючы штодзённага кіраўніцтва, адчувае сябе ў сваёй тэрыторыі, не заўсёды падна ведаючы круг сваіх абавязкаў. Трэба зразумець, што пасля II з'езда, асабліва пасля пікіты аддзелаў у РК, роля інструктара, як важнейшага рычага ў барацьбе за перабудову партработы, выстрае выкананне дырэктыў ЦК вялізная.

ХТО ПАВІНЕН ПРАЦАВАЦЬ ІНСТРУКТАР? Перш за ўсё ўпор павінен быць на ПАРТЫЙНУЮ работу. Інструктар абавязан не сам працаваць за ўсіх, а прыводзіць у рух увесь апарат, забяспечваючы нормальнае правядзенне на справе дырэктыў ЦК ва ўсіх звеннях апарата, ва ўсіх первічных партарганізацыях. Інструктар павінен навучыцца выдзяляць у сваёй рабоце ГАЛОЎНАЕ ЗВЯНО, а таксама ВЯДУЧАЕ прадпрыемства, якоўны на воку і ўсе тэхн. Інструктар, вывучаючы, інструктуючы мясцовыя первічныя арганізацыі, павінен ШЫРОКА РАСПАСЎСЮДЖВАЦЬ ПЕРАДАВЫ ВОПЫТ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ, на ім вопыце вучыць нізавыя партыйныя кадры, ЯК ПЕРШ працаваць перадавіцы, а таксама, дзякуючы ад партыйнымі арганізацыямі перадавыя адмоўныя факты, паказваючы, як НЕ трэба працаваць і кіраваць.

Інструктар — гэта БАЯВІК, ён павінен змагацца за рэалізацыю дырэктыў партыі, ставячы вострыя пытанні, з'яўляючыся рычагом не толькі праверкі выканання той або іншай партыйнай дырэктывы, але і АРГАНІЗАВАННЯ гэтай дырэктывы ва ўсе звенні первічных партыйных арганізацый, на справе дапамагаючы рэалізацыі дырэктыў партыі і прыводзячы памылкі.

Рэакторыя партыйныя работнікі тых прадпрыемстваў і гаспадарак, якія мінуцца перакладзі адказнасць за сваю работу на інструктара. Інструктар нясе адказнасць за даручаную яму РК работу, але ён павінен прыводзіць у рух усе звенні нізавых арганізацый і патрабаваць ад сяміх арганізацый адказнасці за выкананне дырэктыў партыі. Неабходна інструктарам на справе скарыстаць свае правы ў самастойным вырашэнні бягучых пытанняў, якія ўзнікаюць перад імі на прадпрыемстве. Інструктар павінен на месцы даваць указанні, што і як выправіць. На раду пытанняў інструктар (як упаўнаважаны РК) можа звяртацца з прапановамі ў адпаведныя раённыя арганізацыі (райсавет, райпрофсавет, нарпіт і інш). Напрыклад, аб дрэнным сталовай на заводзе — у нарпіт: «Мною, як інструктарам РК, заўважаны такія-та недахопы ў сталовай, трэба прыняць меры да выпраўлення». Тым самым мы зможам разгрузіць партапарат ад раду бягучых пытанняў, якія можна вырашыць праз совецкія, прафесіянальныя, кааператыўныя арганізацыі ў парадку апаратыўнай работы і кіраўніцтва.

У тым выпадку, калі ў той або іншай арганізацыі з указаннямі і заўвагамі інструктара не згодны, пытанне павінна вырашацца ў райкоме.

Райкомы партыі, сакратары райкомаў абавязаны сур'ёзна папрацаваць над падняццем ролі інструктара. Па сутнасці інструктар—памочнік сакратара па пэўнай групе прад прыемстваў.

Сакратары райкомаў абавязаны не менш аднаго разу ў пяцідзённу праводзіць нарады інструктароў для аператыўнага вырашэння пытанняў, абучэння інструктараў. Было-б мэтазгодна арганізаваць у раёнах спецыяльныя семінары для інструктароў, для глыбокай прапрацоўкі рашэнняў ЦК, абмена вопытам і т. д. пад кіраўніцтвам кваліфікаваных партыйных работнікаў.

Трэба, каб інструктары прымалі ўдзел у рабоце бюро райкомаў і штодзённа, хоць-бы на самы кароткі час, сустракаліся з сакратаром райкома для аператыўнага вырашэння бягучых пытанняў.

Выконваючы дырэктывы МК і ўказанні тав. КАГАНОВІЧА, маскоўскія райкомы здолеюць узняць на неабходную вышыню работу партыйных інструктароў і тым самым з поспехам выконаць патрабаванні XVII з'езда партыі аб узмацненні аператыўнага кіраўніцтва нізавымі арганізацыямі, аб большай рухавасці і аператыўнасці ў рабоце раённага камітэта.

Партыйныя інструктары абавязаны вышэй узняць ідэйны ўзровень сваёй работы і на справе з гонарам выконваць указанні, якія даны інструктарам тав. Кагановічам на апошнім пасяджэнні бюро МК і МГК ВКП(б).

(З «Рабочей Москвы»)

АБМЕН ВОПЫТАМ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

СА СЛУЦКАЙ МІЖРАЁННАЙ НАРАДЫ ІНСТРУКТАРОЎ РК КП(б)Б

«Абслугоўваю горад, атрымліваю і выконваю асобныя даручэнні РК і галоўным чынам па промкаапэрацыі». Так пачала сваё выступленне на міжраённай нарадзе інструктар Слуцкага РК КП(б)Б тав. **Трыгубава.**

Кароткая сказана, але-ж сказана пра многае. З першых слоў інструктара тав. Трыгубавай відаць, што Слуцкі РК яшчэ не зусім асвабаніўся ад старых метадаў работы і ад гэтай перабудовы пахне да некаторай ступені фармалізмам.

На форме — правільна, — інструктар па гораду, а ў сапраўднасці — адзекі, бо гэта інструктар для асобных даручэнняў РК.

«Праўда» ў свой час указвала Слуцкаму РК аб рэзультатах такой перабудовы. З указаннямі «Праўды» Слуцкі РК КП(б)Б ашрача вынесенай пастановы не зрабіў адпаведных вывадаў.

А рэзультат такой фармальнай перабудовы ў гарадской арганізацыі адчуваецца моцна. Большасць прадпрыемстваў горада сістэматычна не выконвае промфінплана.

Трыгубава — інструктар Слуцкага РК КП(б)Б па гораду не занялася ўшчыльную работай кааперацыі і сталовых, не пацікавілася, як-жа выконваюцца гістарычныя рашэнні XVII партыйнага з'езда ў галіне разгортвання тавараабароту і паляпшэння культурна-бытавых умоў працоўных.

Таварыш Трыгубава не ведае, хто працуе ў кааперацыі, за прылаўкам, хто працуе ў сталовых. Яна ні разу не склікала і не гутарыла з работнікамі кааперацыі і грамадскага харчавання, не ўказвала на недахопы ў іх рабоце, не навучыла, як іх выправіць.

У гэтым у большай ступені вінават і райком. Ён, наперакор партыйным рашэнням, хаваючыся за формай, мае інструктара асобных даручэнняў. Аб кіраўніцтве інструктарамі з боку Слуцкага РК казаў інструктар тав. Лакізо. РК склікаў толькі тры разы, даваў установу. Але-ж гэта без сістэмы, стыхійна. З'ехаліся інструктары — давай правядзем. І правялі.

— Інструктарам працую з красавіка, — кажа тав. Ермольчык (Старобін). Да гэтага часу можна было-б шмат чаго зрабіць. Працаваў упаўнаважаным сакавік і частку красавіка. Раз мне гаворыць:

— Вось табе 5 сельсоветаў і яжджай. Ты інструктар.

— Я паехаў. Што я зрабіў?

Пазнаёміўся з людзьмі. Наладзіў прапрацоўку матэрыялаў з'язду. У калгасе «Каушын», Дамаславіцкага сельсовета, дзе прапрацавалі даклад тав. Сталіна, адразу-ж прыліпіся 140 галадаракаў. У калгасе быў толькі адзін комуніст; настояў у райкоме — далі парторга. Справа палепшылася.

Для таго каб не растварыцца ў 5 сельсоветах, узяў для першага вопыту толькі два. На першы час даў комуністам заданне прапрацаваць артыкул тав. Гікало і пастанову ЦК ВКП(б) аб школе.

Правёў партдзень, дзе прапрацоўвалі адозву ўсебеларускага злёта калгаснік-ударнік. З пачатку склікаў актыў, детальна прапрацаваў гэта з актывам і даў заданне прапрацаваць у калгасах. У час прапрацоўкі адразу-ж праводзілі ў жыццё рад мерапрыемстваў. Напрыклад, у калгасе не было адказнага за лён, тут-жа на сходзе вылучылі. Не было вартаўнікоў — вылучылі вартаўнікоў і інш.

Таксама правялі прапрацоўку майскага пленума ЦК КП(б)Б. Пры прапрацоўцы рашэнняў пленума ў калгасе «Абарона Чырвонай мяжы» комуніст жывёлавод узяў самаабавязацельства павысіць удой малака на ферме на 100 літраў у дзень. Шляхам арганізацыі начных выпасаў, паляпшэння догляду за каровамі, самаабавязацельства выканана.

У калгасе «Пагранічнік» старшыня калгаса комуніст Сцепыц, арганізаваўшы ўзорную глыбокую прапрацоўку ўказанняў тав. Сталіна і рашэнняў з'езда аб жывёлагадоўлі, дабіўся таго, што на ферме няма ніводнай дзесячай процанта адыходу. Цяляты выглядаюць добра. Не дрэнна справа в мясаздачай.

Інструктажу ў рабоце нізавога няма. Прыеду з раёна, раскажу сакратару — і ўсё. Зусім адсутнічае вучоба.

**

Нарада паказала, што арганізацыя груп спачуваючых — важкіх участак. Гэтым важнейшым пытаннем не займаюцца ні інструктары ні райкомы. Чаго варты такі факт, калі ў 2 партколах (пры двух соўгасах) Копыльскага раёна не арганізаваны групы спачуваючых.

Адсутнасць работы са спачуваючымі адчуваецца не толькі ў Копыльскім раёне. Нічога не робяць у гэтым напрамку і Слуцкі, Старобінскі, Чырвона-Слабодскі і Любаньскі райкомы.

В. АНЕТ.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ

ПРАКУРОРУ РЭСПУБЛІКІ тав. КУЗЬМІНУ.

БЕСПРЫТУЛЬНЫЯ БОЛЬНІЦЫ

(ПІСЬМО МЕДРАБОТНІКА)

Работнікам Астравецкай больніцы (Бешанковіцкага раёна) да 8 ліпеня не выдавалі зарплаты за красавік. Работнікі Улыскай больніцы яшчэ не атрымалі зарплаты за май. Такое-ж становішча і ў Хіцінскім, Стрэліцкаскім, Панкоўскім, Новікаўскім, Свіланскім медыцынскіх участках і пават у раённай больніцы.

Сродкі, адпускаемыя па бюджэту, больніцы не атрымліваюць.

З-за адсутнасці грошай астаюцца ў сельмо прадукты, адпускаемыя больніцам па цэнтралізаванаму снабжэнню: цукар, крупа, масла і мяса.

Рамонт больніц зрываецца. Ульская больніца рамантуецца ўжо... 4 гады.

Бешанковіцкая раённая больніца патрабуе капітальнага рамонту. Падлога падгніла, печы неспраўны.

Калі прыходзіш у фінаддзел райвыканкома да тав. Шабантаса, той адказвае: «Няма грошай на бягучым рахунку» і гэта ў той час, калі па бюджэту адпушчана 9 тыс. руб. на рамонт больніц.

Не глядзячы на шматлікія заявы ў ЦП саюза медсанпрацы і райпракуратуру, ніякія меры і да гэтага часу не прынятыя.

МУРАШКА.

БЯЛЫНІЦКАМУ ПРАКУРОРУ тав. НІЧЫПАРЧУКУ

КУЛАЦКІ АГЕНТ НА ЧАЛЕ СЕЛЬСОВЕТА

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

Калгаснік калгаса «Новы свет», Кудзінскага сельсовета, Бялыніцкага раёна Алесь Антончык утаіў ад улику кабана. Старшыня сельсовета Шаўчэнка аб гэтым ведае, але Антончык — свой чалавек, бо ў яго часта можна выпіваць.

Шаўчэнка — сын кулака. Бацьку Шаўчэнка ў перыяд калектывізацыі, як кулака раскулачылі, але ён ухітрыўся пралезці ў калгас. Яго сын Фёдар зрабіўся «актывістам», прабраўся ў рады партыі і зараз працуе старшынёй сельсовета.

БУРНОСАЎ В., ФІЛІПОВІЧ К., ФІЛІПОВІЧ Я. І КАЎБУХОЎ Т.

САКРАТАРУ ЕЛЬСКАГА РК КП(б)Б ТАВ. АЎЛАСЕНКУ.

БЫЛЫ ЦАРКОЎНІК КІРУЕ КАЛГАСАМ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

У калгасе «Чырвоная зорка», Ельскага раёна, намеснікам старшыні калгаса працуе былы царкоўны стараста **Джум Хвядос** — эксплаататар беднаты, які меў раней 40 га зямлі. За ўвесь час яго «кіраўніцтва» згноєна 70 коп жыта і 120 коп пшчкі на полі і 700 пудоў збожжа ў свірне.

У калгасе пасеяна 450 га яравых, з якіх прапалата толькі 180 га, а 270 гінуць ад пустазелля. 64 га аўса пасеяны ў аднавор. 2 га гароху пасеяна гнілым насеннем, якое зусім не прарасло.

У 5-й брыгадзе ў 1933 г. пабудавана канюшня. Да гэтага часу яна не мае страхі. 18 коней, 10 валоў, 34 цялят можнуць на дажджы. Частка збруі згніла і ўтапчана ў гразь. Брыгадзірам гэтай брыгады з'яўляецца заможнік Харко. Ён ужо 5 раз (3 разы праўленнем і 2 разы партсходам) знімаўся з работы, але на невядомых прычынах працуе і да гэтага часу. Калгаснікі здагадваюць, што калі Харко будзе брыгадзірам, яны на работу не выйдуць.

КАЛЯДА АНТОН. ПРЫШЧЭП АПАНАС.

СТАРШЫНІ СІРОЦІНСКАГА РВК тав. БАСЮКЕВІЧУ

ЮРКОЎ АБАРАНЯЕ КУЛАКОЎ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Старшыня Міньковіцкага сельсовета, Сіроцінскага раёна, Юркоў абараняе кулакоў, разбазарвае калгасныя сенажаці. Выключыў з калгаса кулака Баранава Пала, які меў да рэволюцыі 35 гектараў зямлі, Юркоў надзеліў калгасай сенажаццю. Сваяку жаёмкаму Ганашковічу Іосіфу Юркоў адвёў калгасны луг, а ў калгасе не хапае сенажаці.

Калі старшыня калгаса «Чырвоная зара» Павел Баранаў забараніў касьбу калгаснай сенажаці Бенашковіч карыстаючыся абаронай Юркава, напаў на Баранава, стаў пагражаць зброяй.

Юркоў замест таго, каб забяспечыць сенажацямі калгасы, раздаў запасны фонд былым кулакам, з якімі мае цёплую сувязь.

БІРЫЛО.

НАЧПАЛІТАДДЗЕЛА СОЎГАСА «СТАРЧЫЦЫ» КУДРАЕВУ.

СТВАРЫЦЬ ДЛЯ РАБОТНІЦЫ МАСТОВІЧ НАРМАЛЬНЫЯ УМОВЫ

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКА)

Мастовіч Волька працуе ў соўгасе Старчыцы (Чырвонаслабодскі раён) 5 год. Яна хворая і з гэтай прычыны не спраўляецца з перадавымі рабочымі, з-за чаго ў соўгасе да яе нетаварыскія адносіны.

Дырэкцыя соўгаса замест таго, каб даць ёй патрэбныя ўмовы для жыцця, зусім выкінула яе з кватэры. З сакавіка старая і хворая жанчына Мастовіч Волька з малым дзіцём жыве ў склепе аднаго рабочага.

Мастовіч Вольцы патрэбны чалавечыя ўмовы жыцця. Вінаватыя ў яе высяленні з кватэры павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасці.

ТАРАКАНОЎ ІВАН.

ПА СЛЯДАХ НЕНАДРУКАВАНЫХ ПІСЕМ

Селькоры з Ушацкага раёна паведамлялі ў рэдакцыю аб тым, што ў калгасе «Пролетарый», Гарбяцкага сельсовета, шайка злодзеяў **Пабойкіны** Антон, Ціт і Філіп, Рубіс Ягор, Пузікаў Васіль, Страчонак Мая сей, Жогаль Мікола і Авідзеў Іван раскрадвалі калгаснае збожжа.

Следчы Ушацкага раёна паведамляе, што шайка злодзеяў аддана пад суд.

ВЫТВОРЧЫ ПАХОД імя тав. ГІКАЛО

ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ ТОРФУ

ІЗОТАЎЦЫ ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Пісьмо брыгады т. КУРАНЕВА, апублікаванае ў «Звяздзе», знайшло жывы водгук сярод тарфянікоў і тарфяніц БССР.

Ганаровы спіс перадавой калоны байцоў за торф папаўнялецца з ножным днём.

Вось яны, перадавыя брыгады, якія ідуць у авангардзе барацьбы за торф.

Брыгады ШЧЭРБІНА, БАНДАРЭНКІ, МАЛЬЦЭВА, АТРОШЧАНКА, ТАРАЛЛО, ПРОШЫНА (завод «Шлях соцыялізма»); ЗУБАВА і КАРНЕЕНКА (завод «Большэвік»); ЖУРА І ЗАЙЧАНКА (завод імя Гея); СЕЎРУКА, ПЯШКО І ПЕТРУШЭНІ (завод «Свабода»); КАЛІНІКА Фёдара І ЛЕАНЕНКА (Асінторф).

Перадавыя брыгады заводаў «Грыбянёва», «Чырвоны Окцябр», «Звязда», сталі вядомымі ўсім тарфянікам БССР.

Брыгады тт. ЖУРА, ЛЕАНЕНКА, ФЕДЧАНКА І КАЛІНІКА ў дождлівыя дні не зніжалі тэмпаў здабычы торфу, даючы па 55.000 ЦАГЛІН у змену замест 29-30 тыс. па плану.

ЛОЗУНГ БРЫГАДЫ КУРАНЁВА «ЗА 50.000 ТОРФАЦАГЛІН У ЗМЕНУ» ПЕРАДАВЫЯ БРЫГАДЫ ПЕРАТВАРЫЛІ Ў СПРАВУ.

Узяўшы на буксір сваіх адстаючых таварышоў, яны за кароткі час дабіліся вялікіх поспехаў.

Брыгада т. ЛЮБЧЭНКА (Асінторф) у чэрвені свайго плана не выконвала. На дапамогу прышла брыгада т. ФЕДЧАНКА. Пасля сваёй змены яны кожны дзень вучылі, паказвалі, перадавалі свой вопыт.

І ў выніку брыгада т. ЛЮБЧЭНКА з 5 па 8 ліпеня выконвала план на 104,3 проц. замест 77,3 проц. у першую пяцідзённку.

Сама брыгада т. ФЕДЧАНКА перадаючы свой вопыт адстаючым таварышам, яшчэ вышэй узняла тэмпы торфаздабычы, **ВЫКАНАЎШЫ ПЛАН НА 161,2 ПРОЦ.**

Не адстаюць і тарфяніцы.

Дзесяткі брыгад-тарфяніц ужо ўключыліся ў паход імя тав. Гікало і паказваюць высокую якасць работы па сушцы торфу.

Накалы характэрных фактаў. Брыгада т. ЛЁГКАЙ («Большэвік») у маі выканала план на 92,6 проц., у чэрвені — 103 проц., а за першую дэкаду ліпеня 132,7 проц.

Брыгады тт. ЦАЛЕЙКА, ПАНЦЮШКАВАЙ, ГАРБАЧОВАЙ паказваюць сапраўды большэвіцкія тэмпы работы. **КОЖНЫ ДЗЕНЬ ЯНЫ ВЫКОНВАЮЦЬ СВАЁ ЗАДАННЕ НА 160-173 ПРОЦ.**

Брыгады тарфяніц узялі шэфства над баранамі. Кожны дзень устаноўлены дзяжурствы. Інтэрваты ўпрыгожаны зеляніной і г. д. Іх пачын быў падхоплен тарфяніцамі завода ІМЯ ГЕЯ.

На Асінторфе ўжо адкрыт дом адпачынку. Кожны выхадны дзень 30 лепшых ударнікаў Асінторфа весела і культурна адпачываюць у сваім доме.

Але-ж зараз мы павінны асабліва завастрыць увагу на тым, што ў цэлым такія заводы як «Большэвік», «Свабода», «Чырвоная Беларусь», «1-е мая», Асінторф—яшчэ не дабіліся пералому ў сваёй рабоце.

Апошняя дэкада ліпеня з'яўляецца РАШАЮЧАЙ для ўсіх тарфяных заводаў.

Парткомы і профкамітэты павінны сапраўды арганізаваць і узначаліць барацьбу тарфяніцаў за датэрміновае выкананне сезоннага плана.

ФАНГАУЗ.

1. Тав. **Барыкоўскі Антон.** Нач. агрэгата № 7 Асінторфа, першым на заводзе выканаўшы сезонную праграму. Тав. Барыкоўскі сваім асабістым прыкладам выхоўвае рабочых, як трэба здабываць высокакласны торф.

2. Тав. **Франін.** Малады спецыяліст: Працуе на заводзе «Чырвоны сцяг». Паказаў ударным узоры работы па здабычы малага гідратэрфу.

3. Тав. **Зубаў Фядос.** Працуе брыгадзірам на торфазаводзе «Большэвік». Яго брыгада другой у БССР скончыла датэрмінова сезонны план і дае звыш плана 1.500.000 торфацаглін.

4. Тав. **Клачкоў.** Начальнік агрэгата «Большэвік» з'яўляецца лепшым ізотаўцам торфу БССР. За кароткі тэрмін тав. Клачкоў падрыхтаваў 15 маладых рабочых высокакваліфікаваных майстраў торфу.

5. Тав. **Сіскевіч Рыгор.** Брыгадзір торфазавода імя Даўмана. Яго брыгада, датэрміново выканаўшы план, пераключылася на дапамогу Асінторфу па ліквідацыі прарыву.

6. Тав. **Грукава Вольга** — працуе 8 год на торфазаводзе «Чырвоны тарфянік». У гэтым годзе працуе брыгадзірам па асушцы. Брыгада выконвае задание ў паўтара-два разы.

7. Тав. **Карнеенка.** Брыгадзір торфазавода «Большэвік». Датэрміновая скончыў сезонную праграму. Узяў на буксір адстаючых. Пастановай конкурснай камісіі яго торфабрыгадзе прысвоена званне лепшай у БССР.

1.000.000 ТОРФАЦАГЛІН ЗВЫШ ПЛАНА ЎЖО ЁСЦЬ

30 чэрвеня наша брыгада прав «Звязду» звярнулася з пісьмом да ўсіх ударнікаў-тарфянікаў. У гэтым пісьме мы пісалі:

— Таварышы тарфянікі! Мы заклікаем вас разгарнуць спаборніцтва за пасяховае выкананне пастановы пленума ЦК, за першынства ў справе выканання плана торфаздабычы.

Сезоннае задание мы выканалі раней тэрміну на паўтара месяца. Прывітанне ЦК КП(б)Б, атрыманае нашай брыгадай, мабілізавала нас на барацьбу, каб даць краіне больш торфу і лепшай якасці. Дамо ў падарунак краіне звыш плана 1.000.000 цаглін.

Прайшло 18 дзён. Мы маем права зноў гаварыцца. Звыш плана ўжо далі мільён торфацаглін. Да 1-га жніўня сваё абавязацельства мы поўнасцю выканаем.

Лепшыя ўдарнікі Войчанка Сямён, Ніканчук Дзямід і іншыя перадаюць узятых тэмпаў.

На расстаноўку сіл я ўвесь час звяртаю асаблівую ўвагу.

Выкананне норм кожным рабочым правяраю з начальнікам агрэгата штодня пасля работы. Да работы і пасля работы праводзім дзесяцімінутныя вытворчыя нарады.

Андрэй КУРАНЕЎ.
ЗАВОД «ШЛЯХ СОЦЫЯЛІЗМА».

КАНТРОЛЬ ВЫКАНАННЯ—У ЦЭНТР УВАГІ

ЗДАНОВІЧ
ІНСТРУКТАР АРШАНСКАГА РК

Першыя крокі маёй работы інструктарам, сустрэча з партыйнымі арганізатарамі калгасаў, ўпілі мяне ў неабходнасці арганізацыі штодзённага кантролю выканання даных указанняў. Вось клад. Азнаёміўшыся з работай гарта Яруша, я даў яму рад заданняў. Яруш, выслухаў мяне, не выканаў указанняў. Аб гэтым я даведаўся, калі ў другі раз, з 15 дзён, прышоў у калгас. Ям Яруш прызнаўся, што і не даў выконваць.

І нічога яму не сказаў. На наступнае актыва калгаснікаў былі крыты яшчэ рад недахопаў у рабоце калгаса і тав. Яруша, як першы і партарганізатара. Я пераканаўся, што невыкананне маіх указанняў паглыбіла прывы ў калгасе. Гэта яго падрахнула выконваць іх у далейшым.

На нарадзе комуністаў сельсовета быў пастаўлен даклад тав. Яруша і парторга калгаса імя Ліна Бутрына, які заўсёды пачынаў метадамі адміністравання. Калгаснікі не ведалі што робіць, праўленне. Адначасова быў пастаўлен даклад аднаго лепшага арганізатара Зубаўскага сельсовета.

Пасля гэтай нарады партарганізатары Яруш і Бутрын шчыра і ўзяліся за партыйную работу. Я ім дапамагаў. Зараз яны першы парторгі зоны. Калгас імя Ліна, які тры гады быў у пра[illegible], зараз вышаў у рады перадавых.

У калгасе, сельсовеце я бываю некалькі дзён. Працуючы разам з партарганізатарам у партыі, даю ім канкрэтныя ўказанні ў рабоце. Гэтыя заданні я заканчваю і прыкладна праз 15-20 дзён правяраю іх выкананне. Такая сістэма работы ўзняла адказнасць комуністаў, прывучыла іх гаварыць мовай выключна канкрэтных спраў на рабоце і пры сустрэчы са мною. Яны ведаюць, што даныя мною ўказанні я правяраю.

На партыйным дні ў Якаўлевіцкім сельсовеце, дзе прапрацоўваліся пастановы пленума ЦК КП(б)Б, комуністы ў выступленнях бралі на сябе выключна канкрэтныя абавязацельствы і тут-жа высоўвалі арбітра. **Пасля кожнай кампаніі, пры падагульненні работы на нарадзе ўсіх комуністаў зоны, комуністы бяруць канкрэтныя абавязацельствы ў далейшай рабоце. Гэта аблягчае і маю работу. Прыязджаючы ў калгас, я пачынаю сваю работу з праверкі выканання ўзятых абавязацельстваў.** Партыйныя дні, нарады ніколі не цягнуцца 2—2,5 гадзін.

Асаблівую ўвагу я звярнуў на работу з асобнымі комуністамі. Комуніст **Гераськоў** быў знят з работы старшыні калгаса за развал работы, п'янства, бытавое разлажэнне. Ён не цікавіўся партыйным жыццём. Я пачаў часта гутарыць з Гераськовым. Бачу, не дапамагае. Я паняпрэдзіў яго, што пастаўлю пытанне на райкоме. Ён прасіў не ставіць, абяцаў паправіцца. Далі яму нагрузку — старшыня дэпутацкай групы. Група атрымала канкрэтнае задание, і калі Гераськоў убачыў, што яго, як кіраўніка дэпутацкай групы, правяраюць, што з яго патрабуюць работы, ён увесь ёй аддаўся, зусім забыў пра п'янства.

На сходзе кандыдацкай групы быў пастаўлен даклад аб яго рабоце. Уся брыгада, дзе ён працуе, гаварыла аб прыкладах добрай работы Гераськова. Брыгада стала перадавой. Гераськова назначылі намеснікам старшыні калгаса.

Партыйныя дні два разы ў месяц праводзяць самі парторгі ў калгасах, а **трэці партыйны дзень я праводжу для ўсіх комуністаў сельсовета.** Часта праводжу партыйны дзень двух спаборнічаючых сельсветаў, дзе комуністы абменьваюцца вопытам работы. Парадак дня заўсёды загадзя аб'яўляецца. Комуністы рыхтуюцца, прычым партдні праводзім у лепшым калгасе па паетаноўцы партыйна-масавай работы. Вось прыклад. У калгасе «Х з'езд Саветаў» (гэты калгас лічыцца ударным) быў праведзен партыйны дзень па пытанню рынікаў пасеўнай і падрыхтоўкі да ўборачнай. Перад гэтым была праведзена праверка гэтай работы ў калгасе. І вось комуністы, кіраўнікі калгасаў, заслухаўшы прыклады лепшай работы калгаса «Х з'езд Саветаў», адразу перанеслі іх у свае калгасы.

Праверка выканання будзе яшчэ больш планамернай, калі цесна ўвязаць работу інструктароў РК з інструктарамі райза і РК КСМ.

Каб унікнуць паралелізма ў рабоце ўсіх інструктароў раёна, на нарадзе інструктароў райкома КП(б)Б павінны, на маю думку, прысутнічаць інструктары райкома КСМ і інструктары райза, бо вельмі часта ў адзін дзень у калгас або сельсовет прыязджаюць адразу інструктары РК КСМ і райза, а потым [illegible] ніхто ў калгасе не б[illegible].

КЛАСАВЫ ВОРАГ ВЫКРЫТ

Прышла Аўгіня Кузьмінічна ДОЎГАЯ ў калгас «Чырвоны арол» ў мінулым годзе. Яе, як члена партыі, былую батрачку, накіравалі ў калгас раённы камітэт партыі. Яна член партыі з 1927 г. Палітычна граматная. Не вучыла яе. Ніхто ёю не цікавіўся. Пусціла яна к сабе на кватэру інструктара райкома ЛІСАВУ Галіну. Думала Аўгіня, што Галіна ёй будзе дапамагаць разбірацца ў важнейшых пытаннях палітыкі партыі. Памылялася. Галіна атмаўлялася вучыць адсталую Аўгіню, матывуючы гэта адсутнасцю часу.

Путрэм дачувала Аўгіня, што ў калгасе не ўсё добра. Разбурае калгасную гаспадарку класавы вораг. Толькі хто гэты вораг— гэта яе было загадкай. Старшыні калгаса СУДНЕВУ Фёдару яна гаварыла, што ў калгасе ёсць вораг. Ён вывозіць са строю коней. Не ведала Аўгіня таго, што СЯДНЕЎ Фёдар, СЯДНЕЎ Сяргей моцна звязаны з былым дзіком СУХАЧЭЎСКІМ Андрэем. Не ведала яна, што фактычна калгасам верхаводзіць Сухачэўскі. І толькі тады ўсё стала зразумелым для Аўгіні, калі з ёю пагаварыла, як кажуць, па душах жонка Сухачэўскага.

— Аўгіня, вось твае рукі ў мазолях. Ты працуеш і дзень і ноч. І ўсё на каго? На гэтых нехрысцяў. Бач, жыды не працуюць з сабой разам».

— Вось дзе наш вораг,—не сцярпеўшы зазвіла Аўгіня. Вораг паўстаў перад яе вачыма ва ўсім сваім жаслым выглядзе. Яна тады запісала партыю БАРДЗІЛОЎСКАМУ аб тым, пра што даведалася ад Сухачэўскай.

— А хто туў?

— Ніхто. Пяўжо ты мне не чорыш?

— Ну, ты гэтага не зможаш даказаць,—упэўнена заявіў Бардзілоўскі.—А яна можа адмовіцца ад сваіх слоў.

Аўгіня пачынае прыглядацца да дзеянняў Сухачэўскага і Сяднёвых. Сухачэўскага Сяднёў стаўіць вартаваць калгасное дабро і разам крадуць яго. Сухачэўскі выводзіць са строю лепшую кабылу, і яго не адпускаюць пад суд. Яна тады звярнулася да Лісавай і давай ёй расказваць усё па парадку.

— Ладна, расследую, — заявіла Лісава. А аднойчы, спаткаўшы Сяднёва, яна яму кінула папрок:

— У цябе Сухачэўскі дрэнна вядзе сябе.

— Хто табе казаў?

— Аўгіня Доўгая.

Адсюль і пачалося. Сяднёва Сяргея жонка паведаміла ўсім калгаснікам аб тым, што нібыта яна бачыла як Аўгіня крала сметанку разам з калгаснікам малочнай фермы Тацянай Ефімавай. Гэтым лепшым ударніцам пачынаецца ярлык злодзея.

Але класавы вораг на гэтым не спыняецца. Ён ідзе далей. Сухачэўскі, Сяднёвы запраслі да сабе ў госці нестачковага пастуха ВАРАНОВІЧА з сынам і доктара ВЕВЕЛЯ. Добрая кампанія, нечага скажаць.

Пад раніцу п'яная кампанія прыйшла да згоды. Сын Варановіча павінен быў пайсці красці да Аўгіні. Перад ім была пастаўлена задача — забіць Аўгіню. Доктар Вевель павінен быў потым выдаць давецку аб пабоях Варановіча.

Так было і зроблена. У Аўгіні быў украдзен пуд мукі. Варановіча злупіў муж Аўгіні. Выбегчая Аўгіня атрымала жалезам па галаве. Збеглися калгаснікі. Аўгіню ледзь жывую занеслі ў бальніцу.

Суд. Справу вядзе судзея КАЦАЎ. У Варановіча давецка аб пабоях. Яна яго выручае. Ён атрымлівае 2 месяцы прымусовых работ. На тым тэрмін асуджан быў і муж Аўгіні Доўгай.

Аўгіня зноў у калгасе. Яе на кожным кроку кампраметуюць. Яе даводзяць да слёз. І ўся гэта агідная гісторыя творыцца ў самых Крупках, пад носам раённых арганізацый.

На сходзе, дзе абмяркоўвалася гэта пытанне, калгаснікі заявілі:

— Калгас наш быў-бы моцным, калі-б не ворагі нашы, як Сухачэўскі, сядзелі ў ім. Да нас у калгас ніхто ісці не хоча. Прапоўку хто сарваў? — Сухачэўскі. Авёс хто травіць? — Сухачэўскі. Хто цкуе лепшую калгаснічку Аўгіню? — Сухачэўскі, Сяднёвы Фёдар і Сяргей. А хто падпіску на пазыку сарваў? — Таксама гэта кампанія...

Сухачэўскі з калгаса выкінут. Але гэтага мала. Гэтым фактам з'яўляюцца выявіцца таго, што крупская партыйная арганізацыя перабудавалася фарсальна, а не па сутнасці.

Да гэтага часу існуе тэрытарыяльны партыйны камітэт, але чамусці структуры партарганізацыі мястэчка Крупкі не датычыць статут партыі. Сакратар парткома Бардзілоўскі таксама, як і інструктар Лісава, фармальна па-бюракратычнаму адносяцца да заяў Аўгіні Доўгай, не дапамаглі ёй у выкрыцці дзейнага класавага ворага, далі магчымасць антысаветку доўга адсіджвацца з лепшых калгаснікаў і гэтым самым падарвалі работу калгаса.

Аб комуністах Лісавай, Бардзілоўскім і Лесавіку (старшыня нестачковага совета), павінен сказаць сваё слова райком партыі.

МАНЬКОЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: «ЗВЯЗДА» ЧАКАЕ ТЛУМАЧЭННЯЎ АД КРУПСКАГА РК КП(б)Б ПА СУТНАСЦІ ПЫТАННЯЎ, УЗНЯТЫХ У КАРЭСПАНДЭНЦЫІ Т. МАНЬКОВА.

РАШАЮЧАЯ ЗАДАЧА У БАРАЦЬБЕ ЗА БОЛЬШЭВІЦКІЯ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫЯ КАДРЫ

У ПЕРАДАВОЙ АД 15 ЛІПЕНЯ «ЗВЯЗДА» ЎКАЗВАЛА, ШТО ПЫТАННЕ АБ ЗАГАДЧЫКУ ФЕРМЫ, АБ АЧЫШЧЭННІ КАДРАЎ ЗАГАДЧЫКАЎ АД КУЛАЦКАГА АХВОСЦЯ І ЖУЛІКАЎ, ПАДБОРЫ ПРАВЕРАНЫХ УДАРНІКАЎ НА ГЭТЫ АДКАЗНЫ ПОСТ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВАЖНЕЙШЫМ ПАЛІТЫЧНЫМ ПЫТАННЕМ. НЕ ВЫРАШЫЎШЫ ПЫТАННЯ АБ КАДРАХ ЗАГАДЧЫКАЎ ФЕРМ, НЕЛЬГА ПАСПЯХОВА ПРАВОДЗІЦЬ У ЖЫЦЦЁ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

ТАМ, ДЗЕ ЗАГАДЧЫКАМІ ФЕРМ З'ЯЎЛЯЮЦЦА КУЛАКІ, ДЗЕ НЕ ПРАВЯРАЮЦЬ, ПІЛЬНА НЕ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ КАНДЫДАТУРУ КОЖНАГА ЗАГАДЧЫКА, ТЫМ БОЛЬШ ТАМ, ДЗЕ НЕ ВЕДАЮЦЬ ГЭТЫХ КАДРАЎ,—ТОЛЬКІ БАЛБОЧУЦЬ АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ, А НЕ ЗАЙМАЮЦЦА БОЛЬШЭВІЦКАЙ СПРАВАЙ, ЧЭРЫКАЎСКІ РК ЗА АПОШНІ МЕСЯЦ ПРЫНЯЎ РАД ПАКАЯННЫХ І КЛЯТВЕНЫХ РЭЗАЮЦЫЙ, «А ВОЗ И НЫНЕ ТАМ».

ЦІ НЕ ПАРА ПЕРАСТАЦЬ БАЛБАТАЦЬ, ТАВАРЫШЫ З ЧЭРЫКАЎСКАГА РК І РВК? НЯХАЙ УЛІЧАЦЬ ГЭТА КІРАЎНІКІ І ІНШЫХ РАЁНАЎ, ПАСЛЯ ЧЭРВЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК ТОЛЬКІ ТОЕ КІРАЎНІЦТВА МОЖА СТАЯЦЬ НА ЧАЛЕ РАЁНА, ЯКОЕ КАНКРЭТНА, ДЗЕЛАВІТА, З БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПІЛЬНАСЦЮ ПАДБІРАЕ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫЯ КАДРЫ І РУХАЕ ЎПЕРАД СПРАВУ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

У ЧЭРЫКАВЕ ЗАСМЕЧАНЫ КАДРЫ ЗАГАДЧЫКАЎ ФЕРМ

ЧЭРЫКАЎ, 14 ліпеня. (Карэспандэнт «Звязды»).

З старонак «Звязды» пролетарская грамадскасць ужо ведае аб вялікіх прарывах на фронце жывёлагадоўлі ў Чэрыкаўскім раёне.

Уважліва прааналізаваўшы становішча жывёлагадоўлі ў раёне, не дзяка прысці да выводу, што галоўныя прычыны прарываў у тым, што ў раёне партыйныя і совецкія арганізацыі, асабліва кіраўнікі райза, не ведаюць кіруючы склад жывёлагадоўчых ферм. Сярод загадчыкаў ферм, дагляднчыкаў жывёлы, конюхаў, не вядзецца літаральна ніякай работы.

У раёне 46 свінаферм, 12 малочна-таварных ферм, 30 цялячых. Кіраўнікі і радавыя работнікі ферм складаюць, такім чынам, нямалую армію, у руках якой фактычна знаходзіцца лёс жывёлагадоўлі.

Але хто непасрэдна кіруе работай на ферме, хто даглядае, корміць, вырашчвае жывёлу — у раёне не ведаюць. У раёне няма нават уліку загадчыкаў ферм.

Адсутнасць штодзённай работы з кіраўнікамі і работнікамі ферм, пагардлівая, апартуністычная, па сутнасці, недаацэнка гэтай важнай работы дае паўнейшую магчымасць класава-варожым элементам акапацца на фермах і нават на кіруючых пасадах у іх і безперашкодна праводзіць сваю варожую работу.

Трэба адзначыць, што нават пасля выступленняў «Звязды» ў раёне не прыступілі да ачыстки ферм ад класава-варожых элементаў, да вылучэння на гэты ўчастак вопытных, праверaных на калгаснай рабоце калгаснікаў.

Загадчыкам МТФ калгаса «БОЛЬШЭВІК», Глінскага сельсовета, звыш 6 месяцаў з'яўляўся кулак ЦЫБУЛЯ. Гэты вораг проста атруціў 17 цялят і 8 коней. Аб тым, што Цыбуля кулак, у раёне, і нават у райза, даведаліся пасля сігналаў «Звязды».

Заможнік Кунчанка Маргел у калгасе імя Максіма Горкага, Рынкаўскага сельсовета, узначальвае дзве фермы (МТФ і свінагадоўчую). Што-ж робіць воўк у авечай скуры? Ён наставіў жывёлу ў будынку, які знаходзіцца на балоце, хоць добрых будынкаў у калгасе шмат. На гэтай ферме раскрадваюцца кармы. Мае месца падзеж не толькі маладняка, але і буйнай жывёлы.

Загадчыкам фермы калгаса «Чырвоная Беларусь» гэтага-ж сельсовета доўгі час працаваў Маскалёў. Аб тым, што Маскалёў кулак, даведаліся тады, калі правяралі прычыны падзяжу 9 парасят і дрэннай упітанасці рагатай жывёлы.

Загадчык фермы калгаса «Чырвоны маяк», Хаўмянскага сельсовета — былы кулак Сергіенка — корміць цялят сурагатамі, а камы забірае сабе. Гэта выклікала падзеж 9 цялят з 14 цялят прыплоду гэтага года.

Вялікая засмечанасць кіруючага складу ферм у Горкаўскім сельсавеце. (калгасы імя Сталіна, імя Варашылава, «Шлях да соцыялізма»). З племянныя фермы калгаса «Шлях да соцыялізма» гэтымі дня прадалі 9 пародзістых свіней, якія павінны былі быць зданы ў другія фермы раёна. Да рэчы, пакупнікамі гэтых свіней з'яўляюцца адказныя работнікі, сярод якіх начальнік міліцыі Войтаў і дырэктар банка Фёдараў.

Толькі засмечанасцю кіруючага складу ферм тлумачыцца вялікі адыход цялят і недапушчальна нізкая таварнасць ферм. Гэтым і тлумачыцца патражаючае становішча конскага паголоўя ў раёне.

Есць у раёне значная колькасць дробных ферм, якія ўзначальваюцца добрасумленнымі, адданымі калгаснай справе кіраўнікамі.

Узяць хоць-бы ферму калгаса «Чырвоны Сормавец» (загадчык т. Развадоўскі), або ферму калгаса «Гігант», Рэчыцкага сельсовета (загадчык т. Саўкін Тарас). На гэтых фермах намаганнямі саміх загадчыкаў наведзен большэвіцкі парадак. Гэтыя фермы не ведаюць што такое падзеж. Аднак, і пра іх у раёне мала хто ведае, іх вопыт не перадаецца другім фермам. Работнікі гэтых ферм не збіраюцца, іх не вучаць, ім не створаны патрэбны аўтарытэт. І пасля гэтага зусім ясна, чаму ў раёне з 88 ферм толькі ў вышэйпералічаных двух фермах уведзена здзельшчына.

АРЦЕМ СТАЛЬ.

РАБОЧАМУ—ВЫСОКАЯКАСНЫ І ТАННЫ АБЕД

Усебеларускі злёт ударнікаў грамадскага харчавання, які ўчора адкрыўся, павінен завастрыць увагу на задачах далейшага паляпшэння грамадскага харчавання.

Аналіз работы сістэмы грамадскага харчавання за першае поўгодзе гаворыць аб нездавальняючых разультатах. Вялікія хібы ёсць у рабоце сталовых. Яны яшчэ не сталі ўдарнымі цэхамі прадпрыемстваў.

З месяца ў месяц не выконваецца промфінплан. За першы квартал заданне па выпуску прадукцыі выканана на 81,4 проц., па звароту на 79 проц., за другі квартал па прадукцыі на 89,1 проц., па звароту на 93,0 проц.

Не лепшыя вынікі маем і на ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ. Выдаткі звароту значна перавышаюць устаноўленыя нормы: замест 20 проц. — 26 проц. Асабліва дрэнна працуюць сталоўкі Оршы — 35 процантаў выдаткаў, Мазыра — 32 проц., Барысава — 31 проц. У большасці сталовых перавышаны штаты, не ўшчыльнен рабочы дзень, вялікія адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі. Вось чаму набор сырцу ў каштоўнасці абеда складае толькі 72,3 проц. замест планавых 77,0 проц.

Безгаспадарчасць у сталовых прыводзіць да значных страт. Сталовая гомельскай швейнай фабрыкі «КОМІНТЭРН» дала за адзін квартал 10 тысяч руб. страт, менскіх керамікаў таксама 10 тыс. руб., акадэміі навук — 5 тыс. руб. Страты па радзе сталовых ЗРК за адзін першы квартал складаюць 135 тыс. руб.

ЗРК і заводакіраўніцтвы не цікавяцца пытаннем правільнай пастаноўкі калькуляцыі ў сталовых. Сталовая № 7 Аршанскага ЦРК устанавіла зусім адвольныя цэны на сырэц, у рэзультаце кошт абеда перавышан больш чым на 10 проц. У гомельскай кухні-размеркавальніку рахункавод склаў направільную калькуляцыю кошту рыбы: на кожнай порцыі перабіралі з рабочых па 10 кап. Можна прывесці яшчэ факты простага ашуканства і аблічвання рабочых.

Слабейшы ўчастак работы сістэмы грамадскага харчавання — ДЭЦЭНТРАЛІЗАВАНЫЯ ЗАГАТОЎКІ. Удзельная вага мяса-жыравых прадуктаў у агульным балансе дэцэнтралізаваных загатовак зменшылася ў параўнанні з мінулым годам. Гэта трэба аднесці выключна за кошт дрэннай работы нашых арганізацый і нездавальняючага кіраўніцтва з боку Белкаапсаюза.

Замест таго, каб разгортваць дэцэнтралізаваныя загатоўкі, заключаць доўгатэрміновыя дагавары з калгасамі, многія загадчыкі сталовых уступілі на злачынны, яўна незаконны шлях; яны парушаюць канвенцыйныя цэны, пераплачваюць па загатоўках тысячы рублёў, купляюць прадукты на рынку па спекуляцыйных цэнах.

Той факт, што сталовая фабрыкі «Усход» забяспечыла рабочых добраякаснымі мяснымі блюдамі, што сталовыя фабрык імя Клары Цэткін і акулярнай не перажываюць труднасцей са снабжаннем мясам паказвае, што пры ўмелай рабоце можна значна паноўніць цэнтралізаваныя фонды рабочага снабжэння.

Вельмі дрэнна пастаўлена апрацоўка прадукцыі ў нашых сталовых. Часта наглядаюцца безадказныя адносіны да скарыстання сырцу. Процант адыходаў надзвычай вялікі. У сталовай Вышэйшай сельска-гаспадарчай школы палова бульбы пры ачыстцы ўходзіла ў адыходы. У сталовай фабрыкі імя Крупскай повар Кукавінец кідаў у кацёл не ачышчаны прадукт. На заводзе імя Молатава кухар КАРОТКІ забруджваў мяса. Ва многіх выпадках добраякасны сырэц у працэсе работы ператвараецца ў нізкапробную непрыгодную прадукцыю. ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ ЗАЛЕЖЫЦЬ ВЫКЛЮЧНА АД НАС САМІХ. Тут вырашаюць людзі, іх адносіны да працы.

Далёка не на належнай вышыні якасць абедаў.

Стандартныя меню ўсё яшчэ фігуруюць ва многіх прадпрыемствах грамадскага харчавання. Няўважлівыя, нядбайныя адносіны да рыхтавання страў прыводзяць да псавання лепшых прадуктаў.

Многае тут залежыць ад кваліфікацыі работнікаў сталовай. Тэхнічна кухароў пастаўлена нездавальняюча. Арганізаваны 61 гурток, дзе навучаецца каля 900 чал., але гэтыя гурткі працуюць ад выпадку да выпадку, без правільнай сістэмы. Зусім слаба разгорнута тэхнічная вучоба сярод афіцыянтак.

Вопыт перадавых сталовых паказвае, што ў нас ёсць усе магчымасці для таго, каб зрабіць сталоўкі ўзорнымі прадпрыемствамі, каб даць рабочаму высокаякасны, смачны абед.

Сталовая завода імя ВАРАШЫЛАВА ў пачатку года лічылася адной з горшых у Менску. Цяпер у выніку

Тов. ЧОРНАЯ.
КУХАРКА УДАРНІЦА ЗАВОДА ІМЯ ВАРАШЫЛАВА

ударнай работы калектыва сталовая стала паказальнай як у адносінах якасці прадукцыі, так і чыстаты і абслугоўвання спажыўцоў. Вельмі добрая сталоўка фабрыкі «УСХОД». Якасць абедаў — на высокім узроўні. ЗРК і адміністрацыя сталовай добра разгарнулі дэцэнтралізаваныя загатоўкі. Санітарнае становішча сталовай зусім здавальняючае.

За апошні час паленныя сваю работу сталовыя заводаў «Большэвік», імя Молатава, «Комунар», фабрыкі «Комунарка». Па Віцебску на першае месца вышла сталовая акулярнай фабрыкі, якая ўпершыню ў БССР пачала ажыццяўляць тэхпромфінплан.

Якія асноўныя задачы стаяць зараз перад сістэмай грамадскага харчавання БССР?

— Дабіцца, каб усе сталовыя сталі такімі-ж узорнымі, як сталоўкі завода Варашылава, фабрыкі «Усход» і інш.

— Звярнуць максімум увагі на падрыхтоўку і хаванне гародніны. Захаваць і пераапрацаваць 60 тыс. тон гародніны па сістэме грамадскага харчавання — складаная задача. Трэба, каб кожная сталоўка цяпер праверыла свае хавальні, пагрэбы, квасільныя пункты, наяўнасць тары.

— Пабудаваць леднікі ў сталовых, каб можна было забяспечыць сябе ільдом на бягучы год; адсутнасць леднікоў ва многіх сталовых не дае магчымасці захоўваць прадукты.

— Механізацыя сталовых, правільнае і поўнае скарыстанне механізмаў павінна стаць задачай кожнага работніка. Нельга дапускаць далей такіх злачынных адносін, якія мелі месца ва многіх сталоўках, калі бульбачысткі сталі без руху, кожны дзень наймалі людзей для ачысткі бульбы.

— Ад выпадковага штодзённага складання меню неабходна перайсці да сістэмы складання меню на 5-10 дзён наперад і шырока папулярызаваць яго сярод спажыўцоў.

— Пытанне кошту абедаў — пытанне вялікага палітычнага значэння. Наша задача — максімальна знізіць цэны на абеды і павысіць іх якасць. Шляхам змяншэння выдаткаў звароту і захавання канвенцыйных цэн пры загатоўках трэба забяспечыць рабочаму спажыўцу смачны і танны абед.

— Пастаянна свінаадкорму ў пасобных сталоўках паказвае, якія велізарныя магчымасці маем мы для паляпшэння якасці харчавання. Трэба дабіцца, каб пры кожнай буйнай сталоўцы быў свінаадкормачны пункт, забяспечваючы яе мясам і салам.

— Неабходна разгарнуць дэцэнтралізаваныя загатоўкі у адпаведных сталоўках, зонах дзейнасці, на аснове заключэння дагавораў з калгаснімі забяспечыць масавы прыток сельгаспрадукцыі.

І нарэшце, галавая праграма кожнага калектыва — авладанне тэхнікай грамадскага харчавання.

І. ОФЕНГЕЙМ
НАЧАЛЬНІК КІРАЎНІЦТВА ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ.

УСЕСАЮЗНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПАРАВОЗНІКАЎ

Падтрымліваючы прапанову злёта ўдарнікаў Екацерынінскай дарогі і рабочых дэпо Усполле, Хоўрыно, Каўказскае і інш., НКПС, Паліткіраўніцтва НКПС і ЦК саюза чыгуначнікаў разам з рэдакцыямі газет «Правда» і «Гудок» аб'явілі ўсесаюзнае спаборніцтва паравозных дэпо, брыгад і паравоза-рамонтных заводаў.

У спаборніцтве прымаюць удзел: машыністы, іх памочнікі і качагары, рамонтныя слесары, брыгадзіры, майстры і ўсе астатнія рабочыя, а таксама паравозныя дэпо і паравоза-рамонтныя заводы. Спаборніцтва пачынаецца з 1-га жніўня. Канчатковыя вынікі падводзяцца 1-га лютага 1935 года. Пад вядзенне папярэдніх вынікаў з частковым прэміраваннем удзельнічаючых у спаборніцтве праводзіцца 1-га кастрычніка і 1-га снежня.

Прэміраванне праводзіцца начальнікам дэпо, або завода, парторгам і старшынёй мясцкома, якія лепшых ударнікаў і лепшыя брыгады прадстаўляюць для прэміравання ў дарожнае журы, а апошняе, прэміруючы найбольш выдатных ударнікаў брыгады і перадавыя дэпо, прадстаўляюць кандыдатаў на ўсесаюзную прэмію.

ДЛЯ ПАРАВОЗНЫХ ДЭПО УСТАНОЎЛЕНЫ ТАКІЯ УМОВЫ: узорнае ўтрыманне паравоза і поўная адсутнасць псавання паравоза ў дарозе; выкананне норм прабегу і заданай тэхнічнай хуткасці паездоў; максімальная эканомія апалу ад заданых норм; ліквідацыя зрываў спаравай язды.

ДЛЯ РАМОНТНЫХ БРЫГАД, ДЭПО І ЗАВОДАЎ: высокі па якасці рамонт паравозаў; поўная адсутнасць паўторнасці рамонту. Выкананне заданых норм прастою паравозаў у рамонце. Выкананне і перавыкананне заданых норм выпрацоўкі ва ўрочны час. Утрыманне абсталявання, варштатаў, інструмента ў спраўнасці і ўзорнай чыстаце.

ДЛЯ ДЭПО: поўная і своечасовая выдача паравозаў пад паезды, забяспечваючая выкананне дзяржаўнага плана перавозак. Высокая якасць сярэдняга і бягучага рамонту паравозаў, узорнае ўтрыманне паравозаў і як вынік гэтага: адсутнасць псавання паравозаў у пуці і паўторнасці рамонту; выкананне сярэдне-сутачнага прабегу паравоза; наяўнасць процанту хворых паравозаў не вышэй заданых норм; безумоўнае замацаванне спаравай язды; узорнае абслугоўванне культурна-бытавых патрэб рабочых, узорнае ўтрыманне складаў апалу, дэпаўскіх пуцей і канаў, адсутнасць затрымак паравозаў пад экіпіроўкай і спраўнае ўтрыманне водаснабжэння; своечасовае ацяпленне будынка дэпо і будак машыністаў, рамонт дэпо і варштатнага абсталявання.

ДЛЯ ЗАВОДАЎ: выкананне і перавыкананне праграмы рамонту паравозаў і вырабу запасных частак, поўная і своечасовая здача іх дарогам, высокая якасць рамонту паравозаў і выраб запасных частак, адсутнасць браку і недадзелу; зніжэнне сабекошту прадукцыі; узорнае абслугоўванне культурна-бытавых патрэб рабочых і ўтрыманне рабочых месц і тэрыторыі завода ва ўзорнай чыстаце.

УСТАНОЎЛЕНЫ НАСТУПНЫЯ ПРЭМІІ. Для дэпо: 1—першая прэмія ў 250 тыс. руб., 3 другіх прэміі па 150 тыс. руб., 10 трэціх прэмій па 50 тыс. руб.. **Для заводаў**—адна першая прэмія 30 тыс. руб., дзве другіх прэмій па 150 тыс. руб. **Для паравозных брыгад:** тры першых прэміі па 20 тыс. руб., 10 другіх прэмій па 10 тыс. руб., 20 трэціх прэмій па 5000 руб. Для рамонтных брыгад дэпо: 20 прэмій ад 3000 да 20000 руб. **Для рамонтных брыгад заводаў:** 10 прэмій ад 3000 да 20000 руб. Індывідуальных прэмій: 50 ад 1000 да 5000 руб.

Начальнікі заводаў і дэпо, якія атрымліваюць першую прэмію, прэміруюцца асабістымі аўтамабілямі. Будуць таксама прэміраваны партарганізатары, кіраўнікі профсаюзных арганізацый і рэдактары газет, якія здолеюць найлепшым чынам арганізаваць спаборніцтва паравознікаў.

РЭАЛІЗАВАЦЬ РАШ[illegible] ПА АСАР[illegible]ТУ

Менскі гарком КП(б)Б заслухаў інфармацыю аб выніках канферэнцыі па асартыменту, фасону і якасці швэйных і абутковых вырабаў.

У спецыяльна прынятай пастанове па гэтаму пытанню гарком прапанаваў трыкутнікам і, асабліва, дырэктарам прадпрыемстваў неадкладна прыступіць да рэалізацыі ўказанняў і прапаноў, высунутых на самой канферэнцыі і на выстаўцы.

Скаргі рабочых, жонак і дзяцей на дрэнную якасць прадукцыі павінны быць паведаны да усіх рабочых швэйных і абутковых прадпрыемстваў.

У мэтах паляпшэння якасці выпускаемай прадукцыі трэба арганізаваць спецыяльны семінар для прыёмшчыкаў і грамадскіх кантраляраў.

Для вывучэння тэхнічных недахопаў пры пакупцы прадукцыі спажыўцамі, кіруючым работнікам прадпрыемстваў неабходна зарэгістравацца непасрэдна з магазінамі, дзе рэалізуецца іх прадукцыя, прыцягваючы да гэтай справы работнікаў прылаўка.

[illegible]НФЕРЭНЦЫІ

ЛОГІКА ВАДАЛАЗА

А. МІРОНАЎ

Матрос Нікалай Ламаносаў захварэў на «Челюскине». Адно з купаванняў у палынь моцна адбілася на нервовай сістэме. Ламаносава і вынікам адсюль была сільная неўрастэнія. Хворым Ламаносаў выйшаў на лёд. У матроскай палатцы таварышы акружылі яго пастаяннымі клопатамі, Пікалая асвабанілі ад цяжкіх фізічных работ, даўшы яму поўны адпачынак, неабходны для хворага.

***

Пурга цягнулася на працягу трох сутак. Хлопі пургі велізарнымі гурамі вырасталі вакол палаткі. Яны завальвалі ўваходы і рабілі жыхарам палаткі прыхоўзіцца часценька поўга паязяіцца перад чым адчыніліся маленькія дзверы. Шэрае неба, сумна і нізка правісала над бязмежнымі палямі ільду, над маленькай кучкай палаткі. Неба сыпала слёзамі пургі, а вецер завываючы ў ізломах рапакоў, жорстка трапаў сцяг і заганяў у палаткі самых адчайных, рашыўшыхся рабіць прагулкі.

Людзі сядзелі ў палатках кожны па-свойму, цярпячы нудныя пурговыя дні, людзі чыталі і перачытвалі сотні раз чытаныя абрыўкі газет, старонкі замкнуўшых кніжак і з прыхаваным ўхмылкам у адным лісток англійскага журнала, нічога не разумеючы ў словах чужой мовы.

У палатцы матросаў было нудна. У кутку, насопваючы ў спакойным сне раскінуўся маладзенькі Рэпа Бяранаў, ля камелька скай цэнтравана нахіліўшыся над міскай, рукамі размешваў месіва беларус-вадалаз Харкевіч. Ля сцен заняты кожны сваім, ляжалі Сінцоў, Ткач, Дурасаў, Сяргееў і пажылы вадалаз Масалоў.

Бліжэй да камелька, насупіўшыся, аб нечым думаў матрос Ламаносаў. У палатцы вісела густая, як стрэл, цішыня. Яна цісну́ла ўсіх сваёй абыякавасцю, цяжкасцю, нудой. І мімаволі ў самых слабых нараджаліся недарэчныя мыслі, расхіставліся нервы, накіпала незразумелая злосць.

— Няма самалётаў, — цяжка ўздыхнуўшы прамарматаў Ламаносаў. — Відаць яны і не будуць, бо занадта цяжка працаваць у такую пагодку.

— А хіба машына Ляпідзеўскага гэта не самалёт? — сур'ёзна адказаў вялікі матрос Грыша Дурасаў. — Ён-жа вывез жанчын і можа яшчэ прыляцець па нас.

— Дзе там прыляціць, калі ён падлажаў шасі ля Калючына.

— Ну, а калі не Ляпідзеўскі, то звенні Камарына і Вадапянава адчуваюць патрэбу толькі ў двух добрых лётных днях для таго, каб быць у лагеры.

— А вось гэтых двух лётных дзён і не будзе, — злосна прыпадымаючыся на локці ўспыліў Ламаносаў. — Мы вось сядзім тут, а на дварэ ўжо красавік і блізкая вясна.

Усе замоўклі, не лічачы патрэбным працягваць спрэчку. Усе ведалі, што вясна блізка, але ведалі яшчэ і тое, што самалёты — многа самалётаў — блізка ад Ванкарэма і лагера, і патрэбна ўсяго толькі некалькі ясных дзён для таго, каб лагера Шмідта не аставаўся на карце. Разважанні Ламаносава былі смешныя, але кожны ведаў, што хлапец хворы і таму не хацелі жартаваць над ім.

***

Вечарам, пурга не спынілася. Хлопі пургі ў дзікім намёце насіліся па лагеру і ледзяных палях. Вецер з прысвістам кідаў іх у твары адзінокім чалюскінцам, па справах выходзіўшым з палаткі.

І, засмучаны пургой, вечарам зноў загаварыў Ламаносаў:

— Чым чакаць самалётаў, пашлі-б пяшком. Лічы: да берага 130 кілометраў. Нават калі-б праходзіць па 10 кілометраў у суткі, мы-б праз два тыдні былі на беразе. І сродкаў на ратунак трацілі не трэба было-б, і выратаваліся-б хутчэй. А так...

— А так, ты проста дурань, — злуючыся ўстаў у сваім кутку вадалаз Харкевіч. — Пяшком... Падумаеш, які хадок. Ты ў лагеры ледзь можаш прайсці да кухні па абед, а бярэшся хадзіць па 10 кілометраў у суткі.

— А што-ж, не прайду? Вядома, прайду.

— Ну, дапусцім, пройдзеш. Ты пройдзеш, я прайду, яшчэ пройдзе 40 чалавек гэты шлях, а вось астатнія — пройдуць ці не?

— А чаму-б і не?

— Вось чаму. Ты разважай логічна: трэба прайсці 130 кілометраў. Гэтыя 130 кілометраў трэба пакрыць па глыбокаму, па пояс снегу, цягнучы за сабой нарты з хворымі, слабымі, цёплым адзеннем, прымусамі, газай і ядой. Адна такая партачка будзе важыць пудоў пятнаццаць. А нарт трэба ўзяць мінімум чатыры. Бо дарога-ж прадстаіць у 130 кілометраў. Зможаш прайсці?

— Навошта так многа браць? — пагардліва махнуў рукой Ламаносаў. — Можна нагрузіць на сябе толькі прадукты, ну, самае большае, па аднаму спальнаму мяшку.

— Слухай, Коля, не гавары глупства. Ты пройдзеш 10 кілометраў і мала таго, што прамокнуць абутак і вопратка ад снегу, яны прамокнуць яшчэ і ад твайго поту. А дзе-ж ты зможаш праначаваць у 30-градусным марозе толькі ў адным спальным мяшку?

Ламаносаў замаўчаў. У дапамогу вадалазу выступілі 9 астатніх жыхараў палаткі. Яны горача спрачаліся, абараняючы логіку вадалаза, даказваючы Ламаносаву дзікую неабгрунтаванасць яго разважанняў.

— Я застаюся пры сваім, — незадаволена прабурчэў Ламаносаў, улазячы ў спальны мяшок. — Якнебудзь, можа не ўсе, але дойдзем.

***

Раніца блакітная і радасная, поўным штылем распраддзілася над маленькім лагерам Шмідта. Радыст Ванкарэма радасна паведаміў Крэнкелю:

— Ванкарэме добрае лётнае надвор'е. Праз дваццаць мінут лагер вылятаюць самалёты Слепнёва, Молакава, Каманіна. Прыгатуйце адлятаючых пасадачныя знакі аэрадроме.

...Весела гудзелі маторы на ірвучыся ўвысь самалётах. Адлятаючыя горача паціскалі рукі застаючымся ў лагеры, узбуджаныя крычалі словы радасці і надзеі на хуткую сустрэчу.

Ламаносаў падыйшоў да вадалаза Харкевіча:

— Ну, Аляксей, усяго, — хутка ўбачымся на беразе.

— А можа быць ты пачакаеш ляцець, можа пяшком пойдзеш?— іранічна спытаўся вадалаз.

Ламаносаў пачырванеў. Ён шырока абняў вадалаза і абодва яны абмяняліся гарачым развітальным пацалункам.

— Не злуй, Аляксей, — голас Ламаносава крыху дрыжэў, — не злуй, я...

— Ты хворы, Коля, — сур'ёзна адказаў Харкевіч,—я не злую, ты хворы. Улятай, шчаслівай дарогі.

***

Плаўна ўляцелі самалёты ў блакітнае неба. З кабін самалётаў высоўваліся туманныя ў вышыні сілуэты людзей. Людзі махалі шапкамі і рукавіцамі.

«Счастливый путь, до скорого свидания
Счастливый путь, счастливый путь, друзья...»

несліся з ільду развітальныя словы застаючыхся.

АЛЯКСАНДР МІРОНАЎ.

Сёння міжнародны дзень абароны т. ТЭЛЬМАНА

ПАЎТАРА ГОДА Ў ФАШЫСЦКІМ ЗАСЦЕНКУ ТОМІЦЦА ПРАВАДЫР ГЕРМАНСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА ТАВ. ЭРНСТ ТЭЛЬМАН. ЯМУ ПАГРАЖАЕ КРЫВАВАЯ ФАШЫСЦКАЯ РАСПРАВА.

ВЫРАТУЕМ ЭРНСТА ТЭЛЬМАНА! ПАД ГЭТЫМ ЛОЗУНГАМ ПРОЛЕТАРЫІ І ПРАНОЎНЫЯ ЎСЯГО СВЕТУ СЁННЯ І ЗАЎТРА ПРАВОДЗЯЦЬ МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ АБАРОНЫ ТАВ. ТЭЛЬМАНА.

СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ГАЗЕТА Ў ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 19 ліпеня. (БЕЛТА). Агенцтва Інпрэс паведамляе, што пасля ўстак міжнароднага камітэта барацьбы за вызваленне Тэльмана, па працягу некалькіх тыдняў Тэльмана пераводзяць з адной камеры ў другую, з адной турмы ў другую.

Мета гэтага — «падарваць здароўе Тэльмана і перашкодзіць яму падрыхтавацца к абароне на судзе». Да гэтага часу яму не ўручан абвінавачэнні акт.

Камітэт заклікае да пільнасці і ўзмацнення барацьбы за вызваленне Тэльмана.

У Парыжы пачала выходзіць спецыяльная газета пад назвай «У абарону Тэльмана».

***

БЕРЛІН, 19 ліпеня. (БЕЛТА). Учора ў Берлін прыбыла нарвежская делегацыя «Камітэта дапамогі ахвярам фашызма». Делегацыя мае на мэце высветліць, у якіх умовах знаходзіцца Тэльман, Торглер і другія рэвалюцыйныя палітвязьні.

НАРВЕЖСКІЯ РАБОЧЫЯ АДПРАВІЛІ ДЭЛЕГАЦЫЮ К тав. ТЭЛЬМАНУ

СТОКГОЛЬМ, 19 ліпеня. (БЕЛТА). Нарвежскі камітэт дапамогі ахвярам фашызма адправіў 17 ліпеня ў Германію делегацыю, якая па даручэнню 80 тыс. нарвежскіх рабочых і інтэлігенцыі павінна наведаць Тэльмана і Торглера, а таксама расследаваць забойства Эрыха Мюзама і Шэрынгера.

З Капенгагена паведамляюць, што ад дацкай рабочай делегацыі, якая мела даручэнне наведаць у турме Тэльмана, ужо 10 дзён няма паведамленняў. У Данії падзвычай непакоіцца аб лёсе делегацыі. Германская палітычная паліцыя заявіла, што ёй нічога не відома аб дацкай делегацыі.

ВІЗІТ ПОЛЬСКІХ КОНТРМІНАНОСЦАЎ У ЛЕНІНГРАД

ВАРШАВА, 19 ліпеня. (БЕЛТА). Афіцыяльна паведамляецца: польскія контрмінаносцы «Бура» і «Вігар» пад камандаваннем контрадмірала Уперта прыбудуць 24 ліпеня з афіцыяльным візітам у Ленінград. Візіт прадоўжыцца пяцьдзень.

Прадугледжваецца паездка контрадмірала Уперта на чале делегацыі польскіх маракоў у Маскву, дзе яны будуць прыняты вышэйшым ваенным камандаваннем СССР.

ЗАМАХ НА ВІЦЭ-КОНСУЛА ЗША У ХАРБІНЕ

БЕЙПІН, 18 ліпеня. (БЕЛТА). Манчжурскае афіцыёзнае агенцтва «Кокуцу» апублікавала афіцыяльнае паведамленне жандарскага ўпраўлення ў Мукдэне аб замаху на віцэ-консула ЗША Холла, зробленым 16 ліпеня японцам, апранутым у ваенную форму.

Замахавец Цучыяма сарваў з памяшкання генеральнага консульства ЗША вывеску і затым уварваўся ў консульства, пагражаючы штыком віцэ-консулу Холлу. Яму ў гэтым перашкодзілі, ён кінуўся ўцякаць, аднак быў затрыманы.

Паведамленне жандарскага ўпраўлення тлумачыць паступак Цучыяма тым, што ў яго «парушана псіхіка».

Разам з гэтым у Мукдэне на-днях з японскіх салдат збілі германскага камерсанта. Гэтыя выпадкі сігналізуюць аб тым, што сярод японскай ваеншчыны з'яўляецца нянавісць да іншаземцаў, якія пражываюць у Манчжурыі і «перашкаджаюць» Японіі ў дасягненні мэтаў у Манчжоў-Го.

ЗША ЎЗМАЦНЯЮЦЬ ВАЕННЫЯ БАЗЫ НА ЦІХІМ АКІЯНЕ

НЬЮ-ЮРК, 18 ліпеня. (БЕЛТА). Сёння з Вашынгтона ў Фербенса (Аляска) вылятае 10 бомбавозаў новейшай канструкцыі з экіпажам у 30 чал. Учора з Сан-Дыега (Каліфорнія) накіраваліся ў Сан-Францыска 11 гідраплянаў, адкуль яны вылятаюць у далейшы пералёт на Аляску і Алеуцкія астравы. У алеуцкіх водах знаходзіцца цяпер 6 амерыканскіх падводных лодак і 6 эскадрыльяў.

СТАЧАЧНЫ РУХ У ЗША ПАШЫРАЕЦЦА

НЬЮ-ЮРК, 18 ліпеня. (БЕЛТА). Пад націскам бюракратаў АФП (амерыканская федэральная працы) прафсаюзы ў Партленде (штат Орагон) адхілілі аб'яўленне ўсеагульнай забастоўкі да нарады з прыбыўшым з Вашынгтона прадстаўніком урада сенатарам Вагнерам. Радавыя члены прафсаюзаў патрабуюць неадкладнага абвяшчэння ўсеагульнай забастоўкі. Шоферы прадаўжаюць адмаўляцца ад перавозкі морскіх грузаў. Дзейнічаюць толькі шмногія фабрыкі. Учора паліцыяй быў зроблен налёт на памяшканне прафсаюза маракоў. Арыштавана 20 чалавек.

У Сіэтле (штат Вашынгтон) 200 пікетчыкаў адбілі прыстань, на якой штрэйкбрэхеры прабавалі разгрузіць партаналіўное судно.

У Бэцці (штат Монтана) бастуючымі перарэзаны электраправады, вядучыя ў руднікі. У горадзе Колер (штат Вісконсін) 2 тыс. бастуючых адбілі металургічны завод, дзе забарыкадавалася тысяча штрэйкбрэхераў. Бастуючыя аказалі супраціўленне паліцэйскім, неаднаразова атакаваўшым іх з дапамогай слёзатачывых бомб.

Забаставала каля 20 тыс. тэкстыльшчыкаў у штаце Алабама і 7 тыс. шоферaў прыватнага транспарта ў Міаполісе (штат Мінесота). Паводле паведамлення «Юнайтэд прэс», не лічачы бастуючых на ціхаакіянскім узбярэжжы, звыш 100 тыс. рабочых бастуюць па ўсёй краіне, патрабуючы павышэння зарплаты і прызнання прафсаюзаў.

ВАКОЛ ПЫТАННЯ АБ УСХОДНІМ ЛОКАРНО

ПАРЫЖ, 19 ліпеня. (Інф. «Праўды»). У чаканні адказу Германіі па пытанню Усходня-еўрапейскага пакта, французская прэса падкрэслівае прычыны запаўзкі адказу і зноў указвае на ясны сэнс французскіх прапаноў.

«Тан» піша: «Усходні пакт павінен быць прыняты без усякіх агаворак і ўмоў». На думку газеты, германскі ўрад не можа рашыцца даць адказ не таму, што Усходні пакт створыць сур'ёзныя затрудненні для Германіі, а таму, што заключэнне пакта ва ўмовах, якія прадугледжаны, разбурыць усю дыпламатычную ігру нацыянал-сацыялісцкага ўрада, які мае вялікую патрэбу ў поспеху ў галіне знешняй палітыкі».

Газета лічыць, што германскія кіруючыя колы стараюцца як мага даражэй прадаць сваё далучэнне да Усходняга пакта.

Пертынакс заяўляе ў «Эко дэ Парыж»: «Германія стаіць перад дылемай: або далучыцца да праекта пакта і тым самым адмовіцца ад праграмы рэванша і экспансіі, або скінуць маску і раскрыць свае намеры». Аказаўшыся перад гэтай дылемай, Германія стараецца выйграць час і лавіраваць. Выказнік думкі французскага генеральнага штаба Пертынакс рэзка абрушваецца на Польшчу, называючы яе «маўчальнай дзяржавай, якая аказалася ў затруднальным становішчы».

«Польшча—піша Пертынакс—хоча весці дваістую палітыку. Яна хоча мець у запасе саюз з Францыяй на той выпадак, калі справы прымуць дрэнны абарот».

Французская палітыка не можа, на думку Пертынакса, прымірыцца з гэтай дваістасцю. У заключэнне Пертынакс заяўляе: «Ну, што-ж. Польшча вольна рабіць што хоча; але яна павінна будзе зрабіць выбар: або адмовіцца ад саюза з Францыяй, або прыняць абавязацельствы, звязаныя з гэтым саюзам».

НАВАДНЕННЕ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 19 ліпеня. (БЕЛТА). Газеты рысуюць жудасныя малюнкі наваднення. У раёнах, ахопленых навадненнем, гіне ўвесь ураджай толькі што зжатага хлеба. Вялікая колькасць народу—без жылля. Змыты і знішчаны многія гаспадаркі. Урад адпраўляе на дапамогу пацярпеўшым 50 вагонаў хлеба. У радзе месц хлеб падвозіцца на пантонах.

Навадненне пачалося так нечакана, што захапіла ўсіх знянацку. У радзе месц сяляне сядзелі на дахах па двое і больш сутак, без кавалка хлеба. Бушуючай стыхіяй знесены дамы, масты, чыгуначнае палатно. На хвалях несліся чалавечыя трупы. Да гэтага часу не ўдалося яшчэ вывезці жыхароў з усіх пунктаў, якія знаходзяцца пад пагрозай наваднення.

50 ТЫСЯЧ СЕМ'ЯЎ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ СРОДКАЎ ДЛЯ ІСНАВАННЯ

ВАРШАВА, 19 ліпеня. (БЕЛТА). Пазней чым у іншых рэчках пачаўся пад'ём вады Віслы. Навадненне адбываецца пакуль што толькі на вярхоўях Віслы, затапляючы ўсе ваколіцы. Варшаве навадненне пакуль што не пагражае. Падобнага наваднення не было ўжо 100 год. Створан Агульна-польскі камітэт дапамогі пацярпеўшым. Прэм'ер Калоўскі, выехаўшы ў раён катастрофы, заявіў, што ў выніку наваднення 50 тыс. сем'яў засталіся без сродкаў для існавання.

***

ВАРШАВА, 19 ліпеня. (БЕЛТА). Паўпрэд СССР Даўцян выказаў міністру замежных спраў Боку спачуванне з прычыны наваднення, ад якога пацярпелі некаторыя раёны Польшчы. Адначасова Даўцян перадаў тысячу злотых у распараджэнне камітэта дапамогі.

Па Совецкай Беларусі

УРНА З ПРАХАМ тав. ДОЎГАЛЕЎСКАГА ПРЫБЫЛА У СССР

Учора вечарам, праездам з Берліна ў Маскву, у Менск прыбыла урна з прахам тав. ДОЎГАЛЕЎСКАГА. Урну суправаджалі жонка, дачка і брат нябожчыка і совецкіх паўпрэдства СССР у Францыі тав. ГІРШФЕЛЬД.

На вакзале урну сустракалі: намеснік старшыні Совета Народных Камісараў БССР тав. СААК'ЯН, наркамфін БССР т. ХАЦКЕВІЧ, нарком азовы здароўя т. СУРТА, старшыня Верхсуда тав. КУДЗЕЛЬСКІ і інш.

Ад імя рабочых Менска прысутнічала дэлегацыя лепшых ударнікаў завода імя Варашылава.

З кароткім словам на жалобным мітынгу выступіў упаўнаважаны НКЗамежных спраў тав. КАРТАШОЎ.

Пасля мітынга, пад гукі жалобнага марша і «Інтэрнацыянала», урна з прахам тав. Доўгалеўскага адпраўлена ў Маскву.

АЭРАКЛУБ У ГОМЕЛІ

У Гомелі вядзецца падрыхтоўчая работа да адкрыцця аэраклуба. Зараз з лепшых ударнікаў прадпрыемстваў горада набіраюцца і арганізуюцца лётныя групы і групы падрыхтоўкі кадраў авіяспецыялістаў-матарыстаў, авіятэхнікаў, радыстаў. Вучоба будзе праводзіцца без адрыву ад вытворчасці.

Аэраклуб будзе рыхтаваць і парашутыстаў. На стадыёне дрэваапрацовачнага завода імя Гікало будуецца парашутная вышка.

Пачаўся прыём у юрыдычныя і сапраўдныя члены аэраклуба. Завод імя Кагановіча (Гомсельмаш) першы ўступіў у юрыдычныя члены, унёсшы 1000 руб. уступных і 15 тысяч членскіх узносаў. Гомельскі горсовет таксама ўступіў у юрыдычныя члены клуба і апрача ўплаты ўзносаў абавязаўся адрамантаваць адведзенае для клуба памяшканне.

КУЛЬТУРНА-САНІТАРНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ХЛЕБАЗДАТЧЫКАЎ

Да ўборачнай кампаніі ЦК «Чырвонага крыжа» па раённых цэнтрах і пунктах Заготзярно паслана 49 брыгад пырульнікаў, 7 перасовачных зубагабінетаў, 89 санпастоў. Акрамя таго, пры хлебаздатачных пунктах намечана правесці 240 лекцый і гутарак з калгаснікамі. Санітарныя пасты забяспечаны санітарна-асветнай літаратурай і плакатамі.

ВЫПУСК ЗНАЧКІСТАЎ „ГСА"

19 ліпеня на кватэры работніцы швейнай фабрыкі «КІМ» тав. Мехедка адбыўся выпуск 29 значкістаў ГСА (гатоў да санітарнай абароны). Гэта першая фабрыка, якая па-баявому арганізавала работу па ахопу лепшых рабочых прадпрыемства санітарнай работай. Там-жа адбылася выдача значкоў «ГСА». Значкісты ўзялі на сябе абавязацельства ўцягнуць у падрыхтоўку не менш двух значкістаў кожны.

НОВАЯ БОЛЬНІЦА

1 жніўня ў Клінавіцкім раёне адкрываецца новая рэспубліканская больніца для хранічных хворых на 70 ложкаў, у тым ліку 10 дзіцячых. Для больніцы адведзена памяшканне былога дома адпачынку ЦК Чырвонага крыжа.

ПЕРАМОЖЦЫ ПА ЛЕГКАЙ АТЛЕТЫЦЫ

Першае месца на ўсесаюзных спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, якія адбыліся ў Менску, заняла каманда Зах. Сібіры, НА ЗДЫМКУ: каманда пераможцаў. Злева направа: СЛУЖАЕЎ (бег у 1500 метраў—4 мін. 28 секунд). НІКУЛІН (прыжок у вышыню—176 см.). АЛЕКСАНДРАЎ (бег на 100 метраў—11,6 секунды). САХАР (трайны прыжок з разбега—12 метраў 26 см.).

РАДЫЁ-ТЭХНІЧНЫ СУД НАД БАГЕРАМ

18 ліпеня ў клубе металістаў адбыўся радыё-тэхнічны суд над багерам, выпушчаным упершыню машына-будаўнічым заводам імя Варашылава.

У судзе прынялі ўдзел рабочы калектыў завода і прадстаўнікі тарфянога завода «Большэвік».

Кароценькае абвінавачае заключэнне зачытаў старшыня суда: «Першыя чатыры багеры, выпушчаныя заводам імя Варашылава і кіраваныя для работы на тарфяны завод «Большэвік», працуюць з перабоямі.

— Па цэламу раду канструкцыйных непаладак бываюць вялікія прастоі. Багер № 1 на працягу адной змены прастаяў 3 гадзіны з-за паломкі вала».

Пачынаецца допыт сведак. Выступае дырэктар тарфянога завода «Большэвік» т. Шульгоўскі: «Багер — адна з лепшых машын па здабычы торфу. Праўда, ён патрабуе яшчэ цэлага раду канструкцыйных змен.

Часткова некаторыя непаладкі мы знішчылі на месцы. Зараз усе багеры будуць працаваць зусім спраўна.

За апошнія дні мы арганізавалі тэхвучобу рабочых. Гэта дасць магчымасць ліквідаваць усякія паломкі і прастоі».

Каля мікрафона начальнік трэцяга багера тав. Каруба:

— Я ўжо працую на торфяным заводзе не першы год. Але лепшай машыны, чым багер, не бачыў.

— Мой багер дае 40 тысяч дзяцін за змену, замест 25 тысяч па плану. Я правільна расставіў людзей, арганізаваў тэхвучобу з слесарамі і матарыстамі.

Мы ўважліва глядзім за машынай — вось у чым сакрэт нашай перамогі.

Гучнымі воплескамі сустрэла многалюдная аўдыторыя выступленне па радыё з Гомеля рабочага завода імя Варашылава тав. Ланеўскага, які зараз знаходзіцца на торфяным заводзе «Большэвік»:

— Людзі на балоце ў першы час дрэнна даглядалі багер. Праўда, нямала непаладкаў было і па віне нашага завода. Цяпер зусім іншы малюнак.

Рабочыя асвоіліся з машынай. Не месцы нам удалося знішчыць цэлы рад недахопаў у працэсе работы, і зараз большасць машын перавыконваюць свае нормы.

На судзе выявілася таксама, што завод не меў ніякай сувязі з асноўным праектоўшчыкам багера — Інстытутам Сакэторфа. Гэта ў значнай меры замаруджвала хутчэйшае асваенне новай машыны.

Сабраны матэрыял і факты з правядзенага тэхсуда, вопыт работы першых чатырох багераў на торфяным заводзе «Большэвік» павінны быць улічаны рабочым калектывам завода імя Варашылава пры далейшай рабоце.

Л. ГЕНКІН.

СПІС ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ НАКІРОЎВАЮЦЦА ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭТАМ КП(б)Б НА УБОРАЧНУЮ

Кавальчук (ЦСПСБ), Кудзельскі (Верхсуд), Жолудаў (Наркомсоўгасаў), Баскін (БКС), Клімчук (ЦК КП(б)Б), Сурта (Нарком аховы здароўя), Штейнгардт (пам. упаўнаркомсоўгасаў), Валодзько Н. Н. (упаўн. Наркомсувязі па БССР), Баліцін А. Я. (наркамлегпром БССР), Іваноў Д. І. (пам. упаўнаваж. Заготзярна), Вайновіч Ф. А. (кіраўнік «Заготлён»), Малашонак Н. С. (пам. упаўкамзаг СНК), Амбражунас П. Р. (нарком камун. гаспадаркі), Фрыдман Н. М. (радзят. консультант СНК БССР), Царонак А. Р. (Галоўарбітр БССР), Валасевіч П. І. (нач. сектара прамысл. Дзяржплана БССР), Іўры (кіраўн. папергрупы ўпаўкомлеса), Гетнер (старшыня рэўкамісіі БКС), Добрынскі (пам. кіраўн. Белдрэў), Сянькевіч (аспірант БелАН), Грэбенчык (нач. сектара НКамлеса), Аракелаў (дырэктар Белрадыёцэнтра), Васільеў А. Г. (старшыня ЦК КСТУ), Спарыхін Д. В. (нач. спецчасці Наркамфіна), Варшаўскі С. Ю. (нач. кіраўн. Ашчалкас БССР), Талкачоў С. С. (упаўн. інспекцыі кан), Шыманскі П. Ф. (дырэктар корсектара Дзяржбанка), Байрашэўскі А. М. (кіраўнік канторы Усекабанка), Валахановіч В. П. (пам. кіраўн. Промбанка), Абражэвіч М. А. (нач. промсектара Упаўкамзаг), Свірыдаў І. І. (пам. упаўн. Наркамцандпрома), Госія (пам. кіраўніка Лесбел), Лагодзін Н. К. (заг. сектара партвыдзела), Браўковіч Ф. А. (дырэктар ДВБ), Матусаў А. І. (пам. кір Белдзяржкіно), Эймонас Ц. Т. (дырэктар Белкаапсыравіны), Хоўлін С. Е. (нач. Спецадзела ЦСПСБ), Гурэвіч Е. Б. (старш. Шэфбюро ЦСПСБ), Грышкевіч П. Н. (старш. ЦП Працасоюза), Будзін Ш. А. (старш. ЦП друкароў), Мельнікаў Н. В., (старш. ЦП жыв. соўгасаў), Захарава Д. І. (стар. ЦП Фінбакаўск. работн.), Сакалоўскі М. Я. (старш. ЦП Медсанпрацы), Пінкевіч К. І. (старш. ЦП земляробсоўгасаў), Кін В. К. (кіраўн. Белсельбанка), Біге (заг. орграддзела ЦВК БССР), Валькевіч (дырэктар пабудовы Дзяржтэатра), Сянькевіч (заг. промгрупай СНК БССР), Міхайлаў (заг. групай СНК БССР), Кепер (пам. кіраўн. Белшкалатрэста), Бязносаў (старшыня Белдарчкома), Віхнес (інструктар Нацкамісіі ВКП), Цвяткоў (заг. аддзела дарожнага НКА), Пятровіч (заг. сектарам НКА), Рудзінскі (нач. Белводгаса), Ларыкін (дырэктар Ленін. Партвучобы), Парадка), Мамаеў (кіраўн. Галоўпрамстелслужбы), Домбаль, Рагускі.

Нарада адбудзецца 21 жніўня. ЦК КП(б)Б — у зале пасяджэнняў Бюро ў 2 гадз. дня. Яўка ўсіх абавязкова.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР

ДЗЯРЖЦЫРК Сёння і штодзённа
ГРАНДЫЁЗНЫЯ ПРАДСТАЎЛЕННІ Ў 3 АДДЗЯЛЕННЯХ
ПЕРАМЕНА РЭПЕРТУАРА
Пачатак у 9 г. веч. Касы працуюць у рабочай касе ад 12—2 і з 4—6 г. веч., і ў касе Дзяржцырка ад 12—3 і з 6 гадз. веч.
24 ліпеня у 2 г. ночы РАНІЦІНІК пры ўдзеле усёй трупы

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
... ТАКІМ ЗДАРОВЫМ І ВЯСЁЛЫМ СМЕХАМ НЕ ХВАЛЯВАЛІСЯ ГЛЕДАЧЫ ДАЎНО
ГАРМОНЬ
ПОЙДЗЕ З НЕБЫВАЛЫМ ПОСПЕХАМ У МЕНСКУ Ў ГУКАВЫМ КІНО...

Ленінградскі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Бубнова
Рашэннем ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР нанава адкрыт
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.
Факультэт рыхтуе спецыялістаў даследчыкаў і педагогаў ВНУ па наступных спецыяльнасцях: 1) гісторыі старажытнага свету, 2) гісторыі сярэдніх вякоў, 3) гісторыі новага часу, 4) гісторыі СССР, 5) гісторыі нацыянальных і замежных краін.
Адкрыт таксама прыём аспірантаў па ўказаных вышэй спецыяльнасцях.
Прыём заяў да 1 жніўня. Пры падачы заявы неабходна прыкласці наступныя дакументы: аб нараджэнні, аб асвеце (у арыгіналах), аб паходжанні, соцстаноўішчы, аб працэтажы, аб здароўі, водзывы грамадскіх арганізацый, 3 фотакарткі і засведчаную анкету.
Усе паступаючыя трымаюць іспыты па матэматыцы, фізіцы, хіміі, руская мова і грамадазнаўству ў аб'ёме курса сярэдняй школы дзевяцігодкі.
ІСПЫТЫ — З 1 ЖНІЎНЯ ПА 20 ЖНІЎНЯ.
Студэнты гістарычнага факультэта забяспечваюцца стыпендыяй на 90 проц. Размер стыпендыі 90-105 р. Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам.
Заявы і дакументы аб прыёме штодзённа з 11 да 6 г. (апрача выходных, на паштовую адрасу: Ленінград, Універсітэт, Набераж., д. № 7/9. Прыёмная камісія, тэл. № 2-46-18.
Дырэкцыя ЛГУ.

22-га ліпеня, у 7 гадзін вечара пры Дзяржплане БССР (Дом Урада, 5 паверх, пакой 536) пад старшынствам нам. старшыні СНК тав. Галенда
АДБУДЗЕЦЦА
ШЫРОКАЯ НАРАДА
ПА АБГАВАРЭННЮ АСНОЎНЫХ ПАЛАЖЭННЯЎ ПРАЕКТА ПЛАНАВАННЯ І СОЦРЭКАНСТРУКЦЫІ гор. МЕНСКА.
Усім наркаматам, цэнтральным установам, а таксама мясцовым арганізацыям г. Менска трэба ўпаўнаважыць для ўдзелу ў названай нарадзе сваіх прадстаўнікоў. Яўка іх абавязкова.
Запрашаюцца дырэктары і прадсядацелі гарадскіх саветаў, заводаў і фабрык, навучальных, культурна-бытавых устаноў і прадстаўнікі друку.
ДЗЯРЖПЛАН БССР.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Ад 21 ліпеня
НА ЛЕТНЯЙ ЭСТРАДЗЕ ПЕРШЫЯ ГАСТРОЛІ
НА ЭКРАНЕ НОВЫ ГУКАВЫ ФІЛЬМ
КАЗНЬ
ГАРЫН і МІШЭЛЬ
МУЗЫКАЛЬНАЯ БУФАНАДА
Штодзённа чатыры сеансы.
Пачатак у 6, 7-30, 9-15 і 11 гадз.

З 22 ліпеня аб'яўляецца ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ апалавых кніжак НАСЕЛЬНІЦТВА гор. МЕНСКА.
ПАРАДАК ПЕРАРЭГІСТРАЦЫІ НАСТУПНЫ:
асобы, пражываючыя ў жантаўскіх, камунальных і ЖБКТ домах, павінны да 22 ліпеня г.г. здаць апалавыя кніжкі сваім жактам і загадчыкам дамоў.
Асобы, пражываючыя ў прыватных домах, праходзяць рэгістрацыю праз свае аддзяленні міліцыі.
ГАРТОП.

КІНО «СУРТАН» | замежны прыгодніцкі фільм „ЯРМАРКА" у 6 частках | Кіно Інтэрнацыянал | Сёння НОВАЯ ПРАГРАМА

ГАРАДОЦКІ ТЭХНІКУМ МЕХАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ (ТРАКТАРНЫ)
працягвае набор на 1 курс (скончыўшых сем годкаў) і на 3 курс—скончыўшых дзевяцігодку.
Прыёмныя іспыты адбудуцца з 20 па 30 жніўня і з 20 па 30 верасня.
Заявы з дакументамі, запытаннямі і нарэшце для заказу накіроўваць па адрасу: г. Гарадок (БССР), тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі.
Дырэкцыя.

Бабруйскі дашкольны педагагічны тэхнікум абвяшчае АСЕННІ НАБОР студэнтаў на 1 курс тэхнікума, аднагадовыя педкурсы і аднагадовыя дашкольныя курсы ў дзіку 200 асоб.
Прымаюцца скончыўшыя семігодкі, школы павышанага тыпу, ці падрыхтоўчыя да тэхнікума курсы. Жадаючыя паступіць павінны падаць дакументы: аб адукацыі (арыгінал), заверанаю анкету, аб здароўі, аб узросце, аб сацыяльным становішчы і паходжанні. Да заявы трэба прыкласці мерак на 40 кап.
Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам і сталоўкай. Прыём заяў да 20 жніўня 1934 г. Запытаці пачынуцца і верасня.
Заявы падаваць па адрасу: Бабруйск, Пушкінская, 62, Дашкольны тэхнікум.
Дырэкцыя.

Дрыбінскі зоатэхнічны тэхнікум у м-ку Дрыбін, Горацкага р-на, аб'яўляе АСЕННІ НАБОР студэнтаў на 1 курс 90 асоб.
Прымаюцца асобы з асветай не ніжэй семігодкі. Пры паступленні іспыты па грамазнаўству, беларускай мове, літэратуры, матэматыцы, фізіцы і хіміі ў аб'ёме семігодкі. Узрост ад 16 да 30 год.
Прыём заяў да 15 жніўня. Іспыты—з 20 па 30 жніўня. Пачатак заняткаў з 1 верасня.
Да заяў дадаць дакументы: аб асвеце, нараджэнні, здароўі, копію вайсковага дакумента; аб сацыяльным і маемасным становішчы, для аднасобніка—вкладны ліст за апошні год, засведчаную анкету, 2 фотакарткі і на 40 кап. паштовых марак.
Прынятым забяспечваюцца стыпендыяй і замежнасці ад пасяковасці, інтэрнатам, бясплатны. Пры тэхникуме есць пасевы ўлагоднага тэрыторыі, вэрод, падсобная гаспадарка, аднарэчны пункт, малочная жывёла выдзяляцца для палепшэння ўмоў студэнтаў.
Заявы і дакументы накіроўваць па адрасу: м. Дрыбін, Горацкага раёна, Зоатэхнічнаму тэхнікуму, чыт. ст. Цёмны лес Зах. чыг.
Дырэкцыя тэхнікума.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
ВЫДАВЕЦТВА
ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ
Ів. Ф. ШПІЛЕЎСКІ. Беларуская Акадэмія Навук да XV-годдзя БССР, тыр 1.000, стар. 143, ц. 2 р. 75 к.
ПІСЬМЕННІК І МОВА. Зборнік артыкулаў, прысвечаных за культуру мовы. Пад рэд. Андрэя Александровіча, тыр. 3.000, стар. 106, ц. 2 р. 50 к.
ПАЎЛЮК ТРУС. Збор твораў, пад рэд. акад. І. І. Замоціна, праф. М. Н. Шотуховіча, тыр. 1.500, стар. 326, ц. 4 р. 50 к.
ЗАПІСКІ ІНСТЫТУТА ЛІМ. Кн. II-ая, тыр. 2.000, стар. 9[illegible], ц. 2 р.
ВОЛЬСКІ. Праблемы беларускай совецкай драматургіі, тыр. 750, стар. 39, ц. 1 р.
Акад. БУРСТЫН. Праблемы дыферэнцыяльнай геометрыі ў механіцы, тыр. 600, стар. 41, ц. 2 р. 50 к.
ШКІЛЬТЕР. Ладгальскае нацыянальнае пытанне (на латышскай мове, тыр. 1.500, стар. 98, ц. 1 р. 35 к.
ЛЕПІН. Метады правядзення разведак і класіфікацыі тарфяных месцазалягання, тыр. 1.300, стар. 53, ц. 1 р. 70 к.
БУЛГАКОЎ І ЗЯНКЕВІЧ. За правільнае скарыстанне гною, тыр. 2.000, стар. 38, ц. 50 к.
ДОЎГІ. Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі (на латышскай мове), тыр. 1.000, стар. 50, ц. 75 к.
ПРАТАСЕНЯ І РУБАНАЎ. Результаты палявых даследаў з вапнаваннем у БССР, тыр. 2.000 стар. 91, ц. 2 р.
ЛІНГВІСТЫЧНЫ ЗБОРНІК, II, на яўрэйскай мове, тыр. 1.000, стар. 123, ц. 2 р.
БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІ І РУСКА-ЛІТОЎСКІ ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК. Першы спытак, тыр. 1000, стар. 88, ц. 1 р.
КНІГІ ПРАДАЮЦЦА ва ўсіх кнігарнях ДВВ, ВАКТа і райспажыўсаюзаў.

Выпускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж— Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер — І. ПЕДЗІК, ст. друкар — З. РУБІН.

Менск, друкарня «Звязды». Ул. Гапонаўская № 11—3948.